№ 1 (68) / 2009-2010

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК – ВАРШАВА, кастрычнік 2009 – студзень 2010 гг.



*1. Беларускі Сьцяг на 40-мэтровай гарадзкой елцы ў Віцебску, узьнесены Сяргеем Каваленкам 7 студзня 2010 г.*

# БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ СЬЦЯГ У ВІЦЕБСКУ

Апоўдні 7 студзеня на вершаліне галоўнай гарадзкой ёлкі, усталяванай на плошчы Перамогі ў Віцебску, залунаў нацыянальны сьцяг.

Паводле мінакоў і тых гараджанаў, што прыйшлі зь дзецьмі на калядныя сьвяткаваньні або на каток, сьцяг бел-чырвона-белае палотнішча памерам ня менш як чатыры мэтры, разгарнулася над зоркай на версе ёлкі. Людзі адразу зьвярнулі на гэта ўвагу, пачалі фатаграфаваць і здымаць на камэры ў мабільных тэлефонах.

Праз колькі хвілін вакол ёлкі замітусіліся міліцыянты, якія дзяжурылі на плошчы. Тым часам на ёлцы можна было разгледзець і чалавека, які, верагодна, вывесіў сьцяг. Супрацоўнікі міліцыі атачылі ёлку ды выклікалі супрацоўнікаў МНС. Сьцяг на вачох у соцень жыхароў Віцебску здымалі з дапамогай пажарнай машыны: вышыні лесьвіцы хапіла, каб адмыслоўцы ўзьняліся на 40-мэтровую канструкцыю галоўнай гарадзкой ёлкі.

На плошчу зьехаліся з дзесятак міліцэйскіх машын і спэцтэхнікі, сярод супрацоўнікаў МУС гараджане пазналі галоўнае гарадзкое і нават абласное міліцэйскае начальства.

Міліцыянты былі дужа заклапочаныя: навагоднія і калядныя сьвяткаваньні на плошчы Перамогі сёлета праводзяцца ўпершыню, прычым паводле ініцыятывы самога старшыні віцебскага аблвыканкаму Аляксандра Косінца, які аддаў загад усталёўваць гарадзкую ёлку менавіта тут.

Бел-Чырвона-Белы Сьцяг вывесіў на 40-мэтровай вышыні сябра КХП БНФ **Сяргей Каваленка**. Амапаўцы, ашалелыя ад злосьці, схапілі яго, жарстка білі і зьдзекваліся. Сяргей Каваленка ў гэты час, зьвяртаючыся да людзей, якія глядзелі як яго зьбіваюць, гукаў: „Жыве Беларусь! Слава Беларусі!" Паводле ягоных словаў разьзявякі ў гэты час назіралі за зьбіваньнем, нібы „замарожаныя пінгвіны."

„Тое, што зьдзейсьніў Сяргей Каваленка, – гэта мэга-учынак, як нехта напісаў на адным сайце. Узьняцьце Бел-Чырвона-Белага сьцяга – гэта, я лічу, подзьвіг. У палітзьняволенага Сяргея Каваленкі засталася сям'я – жонка і маленькі сынок. І я лічу, што трэба зьбіраць сродкі, каб падтрымаць самае галоўнае – сям'ю. Тады яму спакайней будзе перажыць сьледзтва і дачакацца суду".

Спадар Хамайда распавёў, што да яго часта падыходзяць мінакі, каб абмеркаваць учынак і затрыманьне Сяргея Каваленкі. Прычым большасьць землякоў ня згодная з тым, што за Бел-Чырвона-Белы сьцяг трэба караць, нягледзячы на тое, што ў афіцыйных СМІ акцыя Сяргея Каваленкі апісваецца як сапраўднае злачынства. У газэце „Віцебскі рабочы" аўтарка **Тацяна Бондарава** (заўважце!) напісала так: „знайшоўся мутант, месца якому ў клетцы заапарку…"

Сяргею Каваленку споўнілася 34 гады, ён індывідуальны прадпрымальнік, займаецца рамонтамі і будаўніцтвам. Таму жонка і кажа, што грошай у сям'і магло б быць больш, каб не Сяргеевы арышты за ранейшыя акцыі са сьцягамі. Цяпер Сяргеева маці, малодшы брат, жонка і пяцігадовы сын жывуць разам у двухпакаёвай кватэры – бо зрабіць рамонт у нядаўна атрыманым уласным жытле проста няма на што.

28-гадовы **брат Сяргея Каваленкі Віталь**, які працуе ахоўнікам, застаўся ў сям'і адзіным дарослым мужчынам. Ён згадвае, як Сяргей стаў перакананым беларусам:

„Размаўляў з Барысам Хамайдам, кніжкі па гісторыі Беларусі чытаў. Ён дужа рашучы ў сваіх перакананьнях і перажывае за ўвесь беларускі народ".

***(Паводле радыё Свабода)***



*2. Сяргей Каваленка*

# ЗВАРОТ ДА БЕЛАРУСАЎ АБ ВЫБАРАХ ПРЭЗЫДЭНТА

…У 2011 годзе павінны адбыцца выбары прэзыдэнта. На гэтых выбарах зьбіраецца зноў незаконна балатавацца Лукашэнка. Ад беларускіх выбаршчыкаў улады патрабуюць прыйсьці на галасаваньне і прагаласаваць („за" ці „супраць" – ня мае значэньня), 83% галасоў яму намалююць.

За 15 гадоў антыбеларускага рэжыму беларусы ўжо нагледзеліся на лукашысцкія выбары. Ад галасаваньня нічога не залежыць.

Што рабіць у такім становішчы, калі выйграць антыдэмакратычныя выбары нікому акрамя ўзурпатара ўлады немагчыма?

Людзі павінны сьведама ня йсьці галасаваць (байкот галасаваньня).

Сьведамы няўдзел у фальшывым галасаваньні (байкот) залежыць толькі ад волі і салідарнасьці выбаршчыкаў. Кантроль і фіксацыю байкоту лягчэй наладзіць і задакумэнтаваць. Сілу *народнага* байкоту беларусы прадэманстравалі на апошніх выбарах дыктатуры ў верасьні 2008 года. Усе ясна ўбачылі, што рэжым ня мае ніякай народнай падтрымкі. Цывілізаваны сьвет не прызнаў вынікаў фальшывага „галасаваньня" на пустых выбарчых участках.

Нашым грамадзянам трэба памятаць галоўнае – што Лукашэнка ня мае законнага права балатавацца ў выбарах. Ён сфальсіфікаваў Канстытуцыю і незаконны рэфэрэндум 2004 года, каб выбраць сябе ў трэці раз. Цяпер ён пляное выбраць сябе ў чацьверты раз. Але беларусы могуць перашкодзіць яму гэта зрабіць, калі ня пойдуць галасаваць на ўчасткі. Вось хай тады й намалюе сабе „усенародны давер".

У дзень галасаваньня трэба йсьці не галасаваць, а на цэнтральныя плошчы гарадоў, дэманстраваць свой няўдзел. А тады, як у песьні пяецца: „Мы знаем, што трэба рабіць".

Не – фальсіфікацыі!

Не – ўзурпацыі ўлады!

Усе за байкот!

***Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"***
***Старшыня Зянон Пазьняк***

*Студзень 2010 г.*

# АБ ПАЛІТЫЦЫ ЭЎРАЗЬВЯЗУ

***(Вытрымкі з выступу на кастрычніцкім Сойме КХП-БНФ)***

...За апошні месяц, які мінуў пасьля верасьнёўскага Сойму нашай народнай Партыі, на Беларусі не адбылося ніякіх станоўчых падзеяў ні ў палітыцы, ні ў культуры, ні ў эканоміцы. Гэта ўжо стала звыклым: нацыянальны рэгрэс як палітычная зададзенасьць.

Унутраная рэакцыя ў Беларусі адчувальна ўзмацнілася пасьля прыняцьця існуючага рэжыму ва Усходняе партнёрства. Гэта зьвязана з істотным адмаўленьнем Эўразьвязу ад дэмакратычных каштоўнасьцяў у адносінах з антыбеларускім рэжымам Лукашэнкі. Тут жорсткая заканамернасьць: як толькі адбываецца адмаўленьне ад дэмакратычных прынцыпаў і паслабленьне цьвёрдай пазыцыі ў дачыненьні да дыктатуры, дыктатарскія рэ-

жымы тут жа ўзмацняюць рэпрэсіўны ціск на грамадзтва і робяцца яшчэ больш агрэсіўнымі. Дакладна такое назіралася ў 30-х гадах мінулага стагоддзя з Гітлерам. Але справа ў тым, што „чэмбэрлены” не засвойваюць гісторыю там, дзе яна не адпавядае іхнім інтарэсам. Таму гісторыя, як правіла, паўтараецца ўвесь час, толькі ў іншых абставінах.

Эўропа, фактычна, пагадзілася з ультыматумам (інакш не назавеш) антыбеларускага рэжыму прымаць яго такім якім ён ёсьць без усялякіх умоваў і патрабаваньняў аб дэмакратыі.

Улічваюцца толькі інтарэсы. Эўразьвяз, практычна, цалкам адвярнуўся ад беларускай грамадзянскай супольнасьці. Літаральна ў гэтыя дні, напрыклад, нелегітымная палата ратыфікавала рамачнае пагадненьне з Камісіяй Эўрапейскіх супольнасьцяў аб парадку тэхнічнай дапамогі. Усе праекты тэхнічнай дапамогі будуць ажыцьцяўляцца толькі з дазволу рэжымнай улады. Гэта абазначае, што грошы ад Эўразьвязу павінны выдзяляцца толькі антыбеларускаму рэжыму. Ні пра якую грамадзянскую супольнасьць, дэмакратыю ды правы чалавека гаворкі тут больш няма.

У сувязі з гэтым мушу нагадаць тое, пра што кажу ўвесь час: пра фальшывасьць, падвойны стандарт і выгадніцкі інтэрас эўрапейскай палітыкі. Гэтая палітыка ўскладняецца яшчэ тым, што дэмакратычная сістэма ў сьвеце перажывае глыбокі цывілізацыйны крызіс культуры, якую яна спарадзіла. Гэты крызіс прымае штораз больш разбэшчаныя і збочаныя формы рэгрэсу.

Некалі мы падтрымалі адмену санкцыяў на ўезд у ЭЗ для парушальнікаў права з чыноўнай намэнклятуры сярэдняга зьвяна (бо Эўропа павінна была зрабіць нейкі крок насустрач). Адмена забароны на ўезд для самога ўзурпатара і некаторых спраўцаў злачынства з вышэйшага ўзроўню ўлады абстаўлена ўмовамі і затрыманая да лістападу гэтага года. Цяпер добра відаць, што тактыка саступак і адмены санкцыяў сябе не апраўдала (хоць і паклала пачатак новай усходняй палітыцы). Зараз мы павінны цьвёрда ставіць пытаньне перад Эўразьвязам аб захаваньні санкцыяў для Лукашэнкі і яго злачыннага асяроддзя.

*Зянон Пазьняк*
*Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*

*11 кастрычніка 2009 г.*

# САНКЦЫІ ПАВІННЫ ЗАСТАЦЦА

***(Заява)***

Ад часу падпісаньня пагадненьня аб Усходнім партнёрстве 7 траўня гэтага года назіралася няўхільнае ўзмацненьне рэакцыі, парушэньня правоў людзей і рэпрэсіўнай палітыкі антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі. Зьявіліся новыя палітычныя вязьні, якіх утрымліваюць без суда, пачасьціліся перасьледы настаўнікаў і іншых беларусаў за ўжываньне беларускай мовы. Пашырыліся звальненьні людзей з працы па палітычных прычынах, зачыняюцца праграмы беларускага радыё там, дзе яны ўзьнікаюць. Жорстка перасьледуецца апазыцыйная беларуская моладзь (нематываваныя арышты, зьбіваньні, пагрозы).

Узмацненьне рэпрэсіяў і антыбеларускай рэакцыі сталася магчымым, на наш погляд, у выніку фактычнага і рэзкага паслабленьня ўвагі з боку Эўразьвязу да дэмакратычных каштоўнасьцяў у дачыненьнях з рэжымам Лукашэнкі. Саступкі Эўразьвязу ў прынцыпах і ў дэмакратыі былі адэкватна ўспрынятыя Лукашэнкам як палітычная перамога над Эўразьвязам. Гэта разьвязала яму рукі для далейшых рэпрэсіяў і зьдзеку над беларусамі, над беларускай культурай і здаровым сэнсам у спадзяваньні, што Эўропа гэтага цяпер не заўважыць, а народ сьцерпіць.

Мы прытрымліваемся каштоўнасных і дэмакратычных прынцыпаў у палітыцы і бачым, што рэжымам Лукашэнкі рэальна ня толькі не была выканана ніводная ўмова павароту да дэмакратыі, а наадварот, узмацніўся паварот да антыбеларускай антыдэмакратычнай рэакцыі.

Мы лічым, што санкцыі Эўразьвязу аб няўезьдзе Лукашэнкі і групы асобаў, падазраваных у злачынствах (забойствы людзей) павінны быць пакінуты бяз зьменаў і ні ў якім разе не адменены. Гэтага патрабуе лёгіка падзеяў і элемэнтарная справядлівасьць.

*Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі – БНФ*
*і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*

*Зянон Пазьняк*
*Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*
*і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*

*Юры Беленькі*
*Намесьнік старшыні Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*
*і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*

*Сяргей Папкоў*
*Намесьнік старшыні Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*
*і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*

*11 кастрычніка 2009, г. Менск.*

# ЯГОНАЕ ІСНАВАНЬНЕ – НЕБЯСЬПЕКА ДЛЯ НАЦЫІ

***(Выступ на студзеньскім Сойме КХП – БНФ і БНФ „Адраджэньне”)***

Шчыра кажучы, нават здалёку назіраць за тым, што адбываецца ў Беларусі і як паводзіць сябе рэжым, робіцца нязносным выпрабаваньнем. Можа зблізку інакш выглядае гэты маразм. Усю палітыку, эфір, сеціва запаланілі сваркі паміж мафіямі з адпаведным узроўнем гаварэньня, тэмай і лексікай. Даўно зразумела, што гэтаму ня будзе канца, пакуль яны ня зглумяць і не здадуць усё беларускае і пакуль будзе існаваць антыбеларускі рэжым са сваім начальнікам. На нашых вачах мафія гуляе ў мытны саюз з Расеяй, грызецца за нафту, здае беларускія банкі, а грамадзтва вымушанае на гэта толькі глядзець, ня маючы магчымасьці ўплываць на тое, што адбываецца.

Усё гэта паказвае, наколькі важнай зьяўляецца наша агульная тактычная задача байкоту незаконных выбараў, стварэньня ўмоваў для непрызнаньня рэжыму і падрыхтоўка ўпадку ягонай улады.

Тым часам аналіз і ацэнку ягоных дзеяньняў па мытным саюзе і нафце мы рабіць мусім. Пытаньне з нафтай – брыдкі мафійны гандаль народнымі рэсурсамі, які мы пастаянна бачым і чуем. Больш сур’ёзная справа са здачай беларускіх банкаў. Гэтым падводзіцца грунт пад захоп расейцамі нашай нацыянальнай эканомікі і маёмасьці.

Паўтара гады таму я засяроджваў Вашу ўвагу на тым, што дзейнасьць і далейшае існаваньне Лукашэнкі ва ўладзе становіцца крайне небясьпечным для нашай нацыі і дзяржавы. Увесь гэты час кожны дзень пацьвярджае маю засьцярогу. У вобласьці права даўно існуе палажэньне аб першасным праве на абарону жыцьця. Гэта значыць, што калі нехта некага заганяе ў кут, каб забіць, то чалавек, баронячы сваё жыцьцё, можа зьнішчыць нападніка і не атрымае за гэта ніякай судовай кары.

Наш народ, нашае грамадзтва ўжо даўно загнаныя ў кут цемрай, што захапіла ўладу ў краіне. Адбываецца павольнае (прытым усьвядомленае, мэтанакіраванае) забіваньне нацыі. Але сапраўдная бяда нават ня ў тым, што гэта адбываецца. Драматызм у тым, што нацыя, якая асьлеплена антыбеларускай ідэалёгіяй рэжыму, гэтага вынішчэньня ў значнай частцы сваёй не разумее і нават ня бачыць. Сытуацыя, што склалася, рэальная, а рэакцыя на яе – намінальная, сузіральная і неадэкватная.

Зыходзячы з гэтага становішча, мы накрэсьлілі патрэбныя варыянты дзеяньняў і стратэгіі, каб не ўваліцца ў пабочныя шляхі, не рабіць

другарадныя справы ды не скаціцца ў авантуру. Адсюль зразумелая абавязковасьць нацыянальнага асьветніцтва і наш упор на нацыянальную ідэалёгію, культуру і мову. Паралельная абавязковасьць – гэта абарона незалежнасьці і высьвятленьне агрэсіўнай сутнасьці расейскай палітыкі. Трэцяя абавязковасьць – ліквідацыя антынароднага рэжыму. Тут усе справы сацыяльнага, эканамічнага, культурнага кшталту мусяць быць падпарадкаваныя гэтай абавязковасьці. Кульмінацыйнымі момантамі ў гэтай трэцяй і рашаючай лініі змаганьня становяцца выбары любога ўзроўню. На гэтым цяпер засяроджана галоўнае нашае дзеяньне.

Зьвяртаю Вашу ўвагу на тое, як выразна разьмеркавалася цяпер вікаўская маргінальная апазыцыя пасьля зьмены эўрапейскай палітыкі. Частка (зь Мілінкевічам) пайшла на калябарацыю з рэжымам, падтрымаўшы эўрапейскі прагматызм; іншая частка (АГП, Лябедзькі, Раманчукі) зноў скіраваліся на Маскву; трэцяя частка і маладзёвае асяроддзе трапіла ў яшчэ большую (часам у непасрэдную) залежнасьць ад КГБ, ягоных правакацыяў і авантураў.

Зразумела, што ні з кім зь іх у нас няма сэнсу нешта сур’ёзнае рабіць. Але мы павінны імкнуцца адрадзіць і ўзмацніць наш Беларускі Вызвольны Рух і Беларускую Салідарнасьць. Ва ўмовах нацыянальнай несвабоды і вынішчэньня ўсё, што зьвязана з разьвіцьцём Беларускай Нацыянальнай ідэі, з барацьбой за беларускую мюву, культуру, свабоду і незалежнасьць Беларусі – усё гэта ёсьць галоўная генэральная лінія разьвіцьця нацыі. Толькі яна гарантуе яе сьветлую будучаню. Усё, што з гэтым не зьвязана, ёсьць маргінальнае, пабочнае, коснае і тупіковае.

Генэральную лінію разьвіцьця і будучыню нацыі ў XIX стагоддзі вызначалі такія людзі як Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Кастусь Каліноўскі, дзеяньні і ідэі, якія за імі былі, а не косныя масы спаланізаванай верхавіны, зрусіфікаванага чынавенства і іх галосных артадоксаў. Паланафільства і русіфікацыя у тым стане грамадзтва былі цэнтральна пашыранымі, існавалі на вызначальных пазыцыях, але былі ідэйна правінцыйнымі, пабочнымі і цалкам невызначальнымі ў галоўным разьвіцьці Беларускай нацыі.

Сёньняшняя зрусіфікаваная (вікаўская) апазыцыя, падтрыманая лібэральнай Эўропай, гэтак жа, як і косная маса адэптаў рэжыму, ёсьць на Беларусі зьявай маргінальнай і тупіковай, якая блытаецца на ідэйным узбочы нацыянальнага разьвіцьця грамадзтва у расейшчыне, трасянцы, калгаснай псіхалёгіі і абстрактнай дэмакратыі бяз нацыі і ідэі. Адзін сьмелы ўчынак Каваленкі са Сьцягам Беларусі вышэйшы за ўсё іх мёртвае існаваньне. Пацьвярджэньнем усіх гэтых словаў ёсьць наш Фронт 90-х гадоў і наша дзяржаўная незалежнасьць, якой ён дамогся. Няхай жа веданьне і разуменьне гэтага ўселіць рашучасьць і веру ў нашы душы.

Прасіў бы абмеркаваць на Сойме і прыняць захады да высьвятленьня пытаньня з арыштам нашага партыйнага сябра ў Віцебску спадара Каваленкі. Зноў зьвяртаю Вашу ўвагу, што дзяеяньні рэжыму ў дачыненьні да Каваленкі – гэта мэтады і паводзіны тыпова чужых акупацыўных уладаў. Трэба арганізаваць юрыдычную, палітычную, маральную і матэрыяльную дапамогу Каваленку.

З Богам прыступаем да працы.

Жыве Беларусь!

***Зянон Пазьняк***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*10 студзеня 2010 г.*

# РАСПРАДАЮЦЬ БЕЛАРУСЬ, КАБ ПАЗЬБЕГНУЦЬ АДКАЗНАСЬЦІ

***(Студзеньскі Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ)***

10 студзеня сёлета ў Менску адбыўся чарговы Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Сойм заслухаў выступ сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „Ягонае існаваньне – небясьпека для нацыі” (публікуецца).

З дакладамі выступіў сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі. На фоне чарговай нафтавай спрэчкі паміж Масквой і мясцовым прамаскоўскім рэжымам мы не павінны падманвацца ілюзіяй, што рэжым абараняе нейкія нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Беларусі. Йдзецца выключна аб прыватных інтарэсах рэжымных колаў і асобаў. Той жа мэце служыць татальны распродаж па заніжаных цэнах беларускіх прадпрыемстваў непасрэдна ў расейскія рукі або апасрэдвана праз іранскія і кіпрскія фірмы. Рэжым разгарнуў нават кампанію выпуску аблігацыяў, каб інтэнсіфікаваць і легалізаваць гэты антыбеларускі працэс. Назіраючы за гэтымі аферамі і выступамі лідэраў рэжыму, многія беларусы зразумелі, што рэжымныя колы згубілі ўпэўненасьць у вечным існаваньні іхнага рэжыму. На працягу некалькіх гадоў яны зьбіраюцца цалкам аддаць расейскаму крымінальнаму капіталу нашую нацыянальную маёмасьць і нейкім чынам пазбавіцца ад адказнасьці за сваю антыдзяржаўную дзейнасьць. Але марная іхная ўпэўненасьць у забесьпячэньні ўласнай камфортнай будучыні на беларускай народнай бядзе. У Расеі актыўна разьвіваюцца працэсы распаду, набліжаецца канчатковы калапс імпэрскай сістэмы. Цьвярозыя расейскія аналітыкі бачаць гэта і папярэджваюць, што калапс можа быць „нечаканы і хуткі”, як у выпадку з Савецкім Саюзам. А можа прыняць іншыя формы дэструкцыі. Але для падзеньня імпэрыі дастаткова моцнага палітычнага або сацыяльна-эканамічнага штуршка. Такім штуршком можа стаць маштабная вайна на Каўказе (напрыклад, у Дагестане) або экалагічная катастрофа на Саяна-Шушанскай ГЭС. Вядома, што ў выпадку прарыву плаціны ў зоне бедства апынуцца больш за два мільёны людзей, некалькі вялікіх гарадоў Сібіры. Мясцовыя жыхары зьвяртаюцца да крамлёўскага і мясцовага кіраўніцтва з заклікамі ліквідаваць плаціну, спусьціць ваду і адмовіцца ад эксплуатацыі ГЭС. Але на гэта прэм’ер Пуцін адказвае аптымістычнымі запэўніваньнямі ў стабільнасьці сітуацыі.

Вялізныя чалавечыя ахвяры і сотні тысячаў людзей з сем’ямі, якія страцяць жыльлё і ўсю маёмасьць, – цалкам верагодны варыянт пачатку распаду маскоўскай імпэрыі. Вельмі важна, каб у гэтым крывавым віры не апынуўся беларускі народ. Трэба адзначыць, што разам з антыбеларускім рэжымам адну справу здачы Беларусі ў маскоўскі палон актыўна робіць падстаўная прамаскоўская псэўдаапазыцыя. Вядома, што яе прадстаўнікі (Лябедзька, Раманчук і інш.) зьбіраюцца ў бліжэйшы час накіравацца ў Маскву на вялікую канфэрэнцыю па эканоміцы, дзе маюць намер сустрэцца і абмеркаваць агульную стратэгію з „выдатным эканамістам” Пуціным. Гэтая ж публіка мабілізуецца (за заходнія і маскоўскія грошы), каб заклікаць беларусаў ісьці на выбарчыя ўчасткі ды галасаваць на выбарчым шоў рэжыму. Супрацьпаставіцца гэтым злачынным працэсам павінен наш народ, аб’яднаны ў Беларускую Салідарнасьць.

Выступілі таксама сябры Сойму з розных рэгіёнаў краіны. Яны распавялі пра факты злачыннага распродажу нацыянальнай маёмасьці расейцам. Напрыклад, у руках маскоўцаў апынуўся малаказавод у Горках, што на Магілеўшчыне. Асноўная яго прадукцыя накіроўваецца на Маскву. Маскоўская акупацыйная дырэкцыя выкарыстоўвае мясцовы адміністрацыйны рычаг, каб прымусіць дырэктараў калгасаў аддаваць на малаказавод малако. Маскоўцы за малако не плацяць беларускім калгасьнікам, на пратэсты старшыняў калгасаў адказваюць цынічнымі прамовамі. Такі вось „бізнэс па-руску” прышоў на нашую зямлю.

Усё больш беларусаў пачынаюць разумець антычалавечую практыку пабудовы каласальных вавілонскіх палацавых будынін, у якіх рэжым імкнецца ўславіць і абяссьмерціць сябе. Жыхары Баранавічаў і мясцовыя камунальныя службы зьвяртаюцца да гарадзкога кіраўніцтва з патрабаваньнем грошай на капітальны рамонт жылых дамоў і дарог. На гэта начальства адказвае, што грошы выдаткоўваюцца на лукашэнкаўскія спартовыя палацы. Дзікія па сваёй бессэнсоўнасьці будаўнічыя праекты рэжыма ўжо ўражаюць сваімі маштабамі ўсю цывілізаваную Эўропу. Такіх адносінаў дзяржаўнай улады да грамадзянаў няма нідзе. Патрыёты тлума-



*3. Гарылы рэжыму цягнуць чалавека*

чаць ўражаным людзям, што так можа рабіць з народам толькі захопнік зямлі і ўлады, толькі акупант.

У такіх умовах беларусы павінны арганізаваць усенародны байкот фальшывым выбарам рэжыму, дзе ўсё ўжо вызначана наперад і не залежыць ад волевыяўленьня людзей. Нельга ўдзельнічаць у жульніцкіх „выбарах", у якіх балатуецца ўзурпатар улады на Беларусі.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*10 студзеня 2010 г.*

# ПАСТАНОВА

**Аб пацьвярджэньні пастановы Сойму Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ ад 10 сьнежня 2006 г. і аб паўторным узбуджэньні крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі выбараў 2006 г. у сувязі з новымі ўлікамі**

19 студзеня 2007 года Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ (Партыі БНФ) падаў заяву ў Вярхоўны Суд аб узбуджэньні крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі апошніх прэзыдэнцкіх выбараў у сувязі з паведамленьнем А. Лукашэнкі. Вярхоўны Суд прыслаў нам афіцыйны адказ за подпісам намесьніка старшыні Вярхоўнага Суда спадарыні Шкурдзюк Ж.Б., дзе паведамлена, што адзначаныя намі парушэньні закона „не ўваходзяць у кампэтэнцыю Вярхоўнага Суда" („Беларускія Ведамасьці", – 2007, №1 (60), с. 1-3).

Паколькі адказ Вярхоўнага Суда не стасаваўся з законам (бо нашу заяву Вярхоўны Суд павінен быў накіраваць у ворганы крымінальнага перасьледу), мы зьвярнуліся ў Генэральную пракуратуру з тым жа патрабаваньнем аб узбуджэньні крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі выбыраў. Пракуратура адказала маўчаньнем.

27 жніўня гэтага году ў інтэрв'ю расейскай газэце „Известия" Лукашэнка зноў пацьвердзіў фальсіфікацыю прэзыдэнцкіх выбараў 2006 года. Прытым, удакладніў, што ён „даў каманду" зьмяніць вынікі галасаваньня, падразумяваючы ў гэтым спадарыню Л. Ярмошыну, якая займала тады пасаду старшыні ЦВК.

У сувязі з гэтым Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ пастанаўляе:

1. Выступіць заяўнікам перад судовымі інстанцыямі і пракуратурай па пытаньні ўзбуджэньня крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. кіраўніком выканаўчай улады Лукашэнкам Аляксандрам Рыгоравічам і старшынёй Цэнтральнай Выбарчай Камісіі Ярмошынай Лідзіяй Міхайлаўнай.

2. Падрыхтоўку і падачу іскавых заяваў і давер выступаць ад імя Сойму Партыі БНФ з правам подпісу даручыць намесьнікам старшыні Партыі Беленькаму Ю.А. і Папкову С.П.

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***

*11 кастрычніка 2009 г., г. Менск*

# „Я РАЗУМЕЎ, ШТО ТВОРЫЦЦА МІСТЭРЫЯ"

*29 кастрычніка 1989 году тысячы людзей прайшлі ад Усходніх могілак да Курапатаў, дзе правялі мітынг-рэквіем і ўсталявалі першы крыж. Пра падзеі таго дня ўзгадвае першаадкрывальнік Курапатаў Зянон Пазьняк.*

У жыцьці людзей часам бываюць дзівосныя аб'яўленьні лёсу. Адны бачаць у снах ці ў іншых знаках сваю будучыню, іншыя перажываюць ажыцьцяўленьне мары. За Саветамі, асабліва ў часы брэжнеўшчыны, ужо мала хто думаў пра незалежную Беларусь пад «Пагоняй» і беларускім Сьцягам. Для тых жа, хто думаў, яна была як сьветлая мара, як фантазія, якая нейкім чынам сталася б, – але жыла толькі ва ўяўленьні...

І што ж? Прыйшоў час – і сьветлая мара ажыцьцявілася. Фантазія стала рэальнасьцю. Але не сама па сабе, а нашымі рукамі, справай і воляй. Гэта быў час незабыўнага шчасьця, а за плячыма – крылы.

З Курапатамі іншая гісторыя і іншая мара. Але ў істоце – вельмі падобная. У 70-ых гадах, калі я ўжо ведаў пра Курапаты і калі страшная таямніца гэтага месца мучыла розум, прыгнятала душу, – тады часта думалася, што вось, настане дзень, да якога я дажыву і буду сьведкам, калі здохне Савецкі Саюз і тысячы, моц людзей прыйдзе ў Курапаты і прынясе на сваіх плячах вялікі Крыж, і паставяць яго ў Курапатах на гары ў памяць забітых. І ўзвысіцца ён над усім лесам – Крыж Пакуты, які злучыць жывых.

У 1989 годзе я зразумеў, што хоць Савецкі Саюз яшчэ не сканаў, але вялікі дзень настае. Камуністы пасьля сваёй ганьбы і паразы на Дзяды ў Менску 30 кастрычніка 1988 году цяпер ужо не рашыліся забараніць мэмарыяльнае шэсьце ў Курапаты. Я выклаў свой плян Крыжовага шэсьця і ідэю ўстанаўленьня Крыжа сябрам з кіраўніцтва Фронту. Плян быў прыняты, пачалася праца. Праект і зробленьне Крыжа былі даручаныя групе мастакоў, якой кіраваў сябра Сойму БНФ Аляксей Марачкін. У групе працавалі Алесь Шатэрнік, Хведар Ладуцька, Мікола Купава, Яўген Кулік, Віктар Маркавец і Сяргей Кляшчук. Мастакі выканалі ўсё добра і дакладна. На раніцы 29 кастрычніка вялізны сямімэтровы Крыж быў дастаўлены да Ўсходніх могілак. Адтуль, па асацыяцыі зь мінулагоднімі падзеямі, павінна было пачацца шэсьце.

Я разумеў, што творыцца містэрыя, і шэсьце мусіць быць адпаведным, гэта значыць, адпавядаць сымболіцы падзеі. Яно павінна было мець вобраз і назірацца ў прасторы. Трэба было знайсьці трасу, дарогу для гэтага вобразу. І мы знайшлі гэтую дарогу. Памятаю, што я нават прамераў яе з сэкундамерам у руках.

Мы павялі людзей не вакольна, па вуліцах Каліноўскага ды Сядых, а па пустым касагоры, наўпрост, ад Усходніх могілак, уніз, у пойму рэчкі Сьлепні і потым праз дамбу, зноў на вуліцу гораду. Гэта была амаль на кілямэтар адкрытая мясцовасьць, на якой было шмат пешаходных дарожак. Мы выбралі сярод іх такую трасу, якая зьвівалася хвалямі, як зьмяя, як стужка на ветры. Па дарож-

цы можна было ісьці разам чатыром-пяці чалавекам, і калі дзесяць тысячаў народу выцягнуліся ў даўжэзны ланцуг і пайшлі па касагоры гэтакім бясконцым сэрпантынам, з Крыжам, сьцягамі, харугвамі і кветкамі, пайшлі на Курапаты – відовішча ўзьнікла незабыўнае. Галава шэсьця была ўжо на Лагойскім тракце, а хвост яго яшчэ спускаўся па сэрпантыне ад Усходніх могілках. Так было створанае ня проста шэсьце, а Крыжовы Шлях. Шлях з Крыжам, які на руках нёс народ у Курапаты.

Дарэчы, у вядомым, забароненым фільме Міхаіла Жданоўскага «Дарога на Курапаты» ёсьць кадры гэтага гістарычнага шэсьця. Зазначу, што каб восем кілямэтраў несьці цяжкі Крыж, была створаная каманда чалавек шэсьцьдзесят, якія мелі знакі на адзеньні – белы шасьціканцовы крыж на чырвоным фоне. Але па ходу шэсьця мноства людзей падыходзілі і па пераменцы неслі Крыж. Кожны хацеў яго несьці і далучыцца да містэрыі. Такім чынам, і тут створаны сымбаль – курапацкі Крыж прынёс на руках сам народ.

У Курапатах гучэў Рэквіем. Пад гукі Рэквіему паднялі і паставілі Крыж. Дзясяткі людзей кінуліся дапамагаць, кожны хацеў дакрануцца да яго рукой. Потым сьвятары ўсіх чатырох хрысьціянскіх канфэсіяў, па чарзе, асьвяцілі Крыж. Ад каталікоў – ксёндз Уладзіслаў Завальнюк, ад пратэстантаў – пастар Эрнэст Сабіла.... Вуніяцкія дзяўчаты зь белымі кветкамі пад камандай ксяндза Яна Матусевіча сьпявалі беларускія Псальмы. А з праваслаўнага сабору ў Менску прыехала цэлая каманда зь пяці ці шасьці духоўных асобаў і адслужылі цэлую службу з кадзілам і песьнясьпевамі. Потым ізноў гучаў Рэквіем, і быў жалобны мітынг. Мне вельмі цяжка было яго весьці – душа напоўнілася трымценьнем... Вось яно, думаю, сталася, адбылося, ажыло запаветнае...

А яшчэ ж быў Савецкі Саюз, камунізм, КПСС. І, напэўна, ніхто, акрамя нас, фронтаўцаў, ня верыў у хуткі яго канец. З прамоваў на мітынгу найбольш мне запомніліся словы беларусаў зь вёскі Цна, сьведкаў расстрэлаў у Курапатах. А таксама выступ Янкі Брыля, які расказаў, ізноў жа, амаль містычную гісторыю. Як у Быкаўні, пад Кіевам, у час эксгумацыі знайшлі ў расстрэльнай яме падпісаны цыгарэтны муштук ягонага схопленага НКВДзістамі брата. Пісьменьнік дастаў з кішэні і ўсім паказаў гэты муштук.

Курапацкі Крыж Пакуты павінен быў стаяць на гары, у цэнтры Курапатаў, на месцы, якое цяпер у Курапацкім Народным Мэмарыяле называецца Галгофа. Аднак у 1989 годзе, пасьля прызнаньня ўрадавай камісіяй факту НКВДзіцкіх расстрэлаў людзей у Курапатах, Саўмін хуценька паклаў там вялізарны валун з надпісам, што зьбіраецца тут нешта ўвекавечваць. Хітруны не зьбіраліся нічога рабіць у Курапатах, іхняя задача была – не пусьціць сюды Народны Фронт, абмежаваць ініцыятыву народу.

Ужо і таго Саўміну даўно няма, а камень гэты ўсё ляжыць. Мы паставілі Крыж перад уваходам, на самым пачатку курапацкага лесу, разумеючы, што ён будзе не прадметам, а сакральнай зьявай, сымбалем у памяць пра генацыд. Прыйдзе час, і мы ўсталюем гэты крыж са сталі, на трыццаць мэтраў, на курапацкай Галгофе, каб відаць быў над лесам здалёк. Каб кожны бачыў і разумеў, як трэба берагчы свабоду, жыцьцё, Беларусь і народ.

***Зянон Пазьняк***
***(28.10.2009, радыё Свабода. Інтэрв'ю С. Навумчыка)***

# ПАМЯЦЬ І ЗАБЫЦЬЦЁ КУРАПАТАЎ

Дваццаць гадоў таму, на Дзяды, 29 кастрычніка 1989 г., тысячы людзей, выцягнуўшыся ў ланцуг на некалькі кілямэтраў, ішлі да Курапатаў. Наперадзе калёны неслі сямімэтровы крыж.

Мітынг-рэквіюм у Курапатах вёў Зянон Пазьняк, выступілі Уладзімер Арлоў, Янка Брыль, сябры Народнага Фронту і „Мартыралёгу Беларусі". Крыж, які быў узьняты над урочышчам, асьвяцілі прадстаўнікі чатырох хрысьціянскіх канфэсіяў. Так пачалася народная мэмарыялізацыя Курапатаў. З таго часу кожныя Дзяды адзначаліся шэсьцем у Курапаты, які праводзіў Народны Фронт.

У першай палове 90-ых зьбіраліся ля будынку НКВД, на якім усталёўвалася часовая шыльда з напамінам, што менавіта адсюль пачынаўся шлях у Курапаты для тысячаў сыноў і дачок Беларусі. Сяргей Грахоўскі паказваў вокны камэры ў сутарэньні, дзе ён правёў некалькі месяцаў перад этапам у ГУЛАГ. На кожныя Дзяды сюды прыходзіў Васіль Быкаў і, калі добра сябе пачуваў, ішоў разам з усімі спачатку да Парку Чалюскінцаў (там таксама расстрэльвалі людзей), а потым да Курапатаў. Заўсёды ў калёне – Рыгор Барадулін. Прыязджаў з Масквы Алесь Адамовіч. На Дзяды ў Курапаты прыходзіў і выступаў на мітынгу старшыня Вярхоўнага Савету Станіслаў Шушкевіч. Аднойчы ўскладаў кветкі і старшыня Саўміну Вячаслаў Кебіч. Прыязджаў у Курапаты мітрапаліт Філярэт. На тым самым першым шэсьці ў 89-ым, яшчэ ня ў якасьці архімандрыда, а простага сьвятара побач з Пазьняком ішоў на чале калёны Аляксій Шынкевіч (магчыма, цяпер, калі патрыярх Кірыла ўзгадаў пра Курапаты, гэта здыме пячатку маўчаньня з вуснаў іерархаў Беларускага Экзархату).

За дваццаць адзін год пасьля абнародаваньня праўды пра Курапаты ўрочышча наведалі прэзыдэнты, амбасадары, парлямэнцкія дэлегацыі, шмат замежных журналістаў. У студзені 1994 года каманда Кебіча рабіла ўсё, каб сарваць наведваньне Курапатаў прэзыдэнтам ЗША Білам Клінтанам. Вычарпаўшы арсэнал інтрыгаў, скарысталі апошні аргумэнт: прымаючы бок не гарантуе высокаму госьцю бясьпеку. У такіх выпадках амэрыканская Сакрэтная служба, як правіла, забараняе прэзыдэнту наведваць „аб'ект". Але Клінтан у Курапаты – паехаў. Лукашэнка, як мне вядома, у Курапатах ня быў ніколі, ні ў час дэпутацтва, ні ў часы прэзыдэнцтва. Ні на Дзяды, ні ў нейкі іншы дзень.

У пачатку 90-ых неяк само сабой разумелася, што ў хуткім часе тут будзе ўзьведзены помнік, і ў грамадзтве дэбатавалася – якім быць мэмарыялу? Засядалі ўрадавая і грамадзкая камісіі. Сябра Камісіі па справах рэабілітацыі ахвяраў рэпрэсій пры Вярхоўным Савеце 12-скліканьня Аляксандар Лукашук прапанаваў, для пачатку, абнесьці Курапаты плотам. Архітэктурныя генэралы ўсьміхнуліся – замала (тут было дзе разгарнуцца і ў шырыню, і ў вышыню, а з улікам усясьветнай вядомасьці Курапатаў мэмарыял абяцаў абясьсмерціць імя аўтараў). Урадоўцы адказалі, што зашмат – спатрэбіцца аж паўгоду… Цяпер падаецца, што плот – гэта адзінае, што рэальна можна было зрабіць у той час, бо гэта хаця б засьцерагло Курапаты ад вандалізму. А можа, і не засьцерагло б, бо занадта ўжо пэрыядычна ды арганізавана рушаць крыжы ды раструшчваюць „лаву Клінтана".

Гісторыя Курапатаў апошніх дваццаці гадоў – гэта гісторыя змаганьня супраць духоўнага і матэрыяльнага зьнішчэньня сьвятога месца. Яшчэ са савецкім часам камуністы пачалі ствараць бясконцыя „грамадзкія камісіі" з мэтай даказаць, што Курапаты – фікцыя, што расстрэльвалі не энкавэдысты, а – немцы ў часе вайны. У 2001 годзе пачалі пракладаць трасу, і моладзевыя актывісты наладзілі няспынную вату, паставілі намёты (пра гэта – кніга „Дарога праз Курапаты" у бібліятэцы Свабоды). Потым зьбіраліся пабудаваць ля магілаў „элітны" катэджны пасёлак – ізноў пратэставала грамадзтва…

Улады для Курапатаў ня робяць нічога. Народны Мэмарыял ствараюць актывісты Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ, штотыдзень ладзяць талаку, усталёўваюць новыя крыжы і падпраўляюць раней пастаўленыя, прыбіраюць урочышча ад сьмецьця.

У чым прычыны выразнага ігнараваньня сёньняшнімі ўладамі Курапатаў? Першая і відавочная палягае ў каньюнктуры палітычнай барацьбы. Гаворачы пра Курапаты, цяжка абысьці гісторыю іх адкрыцьця, а тады, адпаведна, трэба называць і прозьвішча першаадкрывальніка. Давядзецца пазначаць імя Пазьняка ў падручніках, пад час экскурсіяў адказваць на пытаньні, дзе ён цяпер і чаму ня можа вярнуцца. Тым часам, вось ужо шмат гадоў прозьвішча гэтае непажадана ўзгадваць зусім – ні ў станоўчым, ні ў нейкім іншым кантэксьце. Няма і не было, забудзьце.

Ва ўсьведамленьні ролі і маштабу гэтай асобы Лукашэнка не арыгінальны – тое ж у свой час разумеў і Кебіч. Аднак існуе і больш глыбокая падстава – гэта ідэйная, палітычная і нават, у пэўнай ступені, кадравая пераемнасьць сёньняшняй улады з бальшавіцкім рэжымам і яго рэпрэсіўнымі ворганамі. Помнікі Леніну, „Лінія Саліна", музэй Дзяржынскага з традыцыйнай прысягай новых чэкістаў – элемэнты ідэалёгіі ўсхваленьня савецкага пэрыяду, „слаўнага мінулага". І тут няма месца праўдзе пра расстрэлы нявінных ахвяраў. Яшчэ і таму няма, што маштаб рэпрэсіяў – уражвае. На падставе навуковых падлікаў (навукова ж і не абвергнутых) Пазьняк называе колькасьць забітых у Курапатах – да 250 тысяч чалавек. Выдадзены ў 1995 годзе даведнік „Беларусь" (Менск,



*4. Са сьцягам у Курапатах*

„Беларуская энцыкляпэдыя") падае – „да 100 тысяч чалавек" (толькі уявіце сабе лічбу ў сто тысячаў не абстрактна. Гэта – колькасьць жыхароў у Наваполацку, ці ў Лідзе, ці ў Маладзечне, ці ў Салігорску. У Полацку, Жлобіне, Светлагорску – меней). Мой знаёмы швэйцарскі журналіст Ульрых Шмідт сказаў, што пры такіх лічбах гаворка павінна весьціся не пра рэпрэсіі ўжо, а – пра этнацыд. І гэта – у адных толькі Курапатах. З такімі лічбамі цяжка казаць пра якія б ні было „перавагі ўсяго лепшага, што стварылі пакаленьні савецкіх людзей" – калі гэтых самых людзей пакаленьнямі і зьнішчалі.

Зразумела, не зацікаўленае у памяці пра Курапаты і ўстанова, якая называе сябе пераемніцай „лепшых традыцый" той самай арганізацыі, якая зьнішчала. Да гэтага часу прозьвішчы курапацкіх катаў засакрэчаныя КДБ. Ды і да інфармацыі пра ахвяраў не дабрацца. Толькі на кароткі тэрмін, у самым пачатку 90-ых, былі прыадчыненыя для дасьледчыкаў архівы КДБ 1930-1950-ых гадоў (і тое ўдавалася прабрацца ў іх ня з першай спробы). Як патлумачыў мне тады старшыня КДБ генэрал Лавіцкі – „Справы ўтрымліваюць імёны ня толькі супрацоўнікаў, але і агентаў. А з моманту заснаваньня ўстановы (ВЧК-НКВД-МДБ-КДБ – С.Н.) мы ня выдалі імя ніводнага агента. Бо калі б выдалі, з намі адмаўляліся б супрацоўнічаць". … Уявіце, што выведка сучаснай Нямеччыны трымае ў сакрэце архівы Гестапа, а канцлер нагадвае, што пры фашызьме „ня ўсё было дрэнна".

***Сяргей Навумчык***

*(28.10.2009, радыё Свабода)*

# ВЕРМА Ў СЬВЕТЛЫЯ ДНІ

…Дваццаць гадоў таму, 29 кастрычніка 1989 г., быў усталяваны курапацкі Крыж Пакуты ў памяць аб расстраляных продках.

Гэты сямімэтровы крыж прынесьлі на руках тысячы людзей праз увесь доўгі шматкілёмэтровы шлях. Яго паставілі тут усе разам пад гукі рэквіема. Сьвятары чатырох хрысьціянскіх канфэсіяў асьвяцілі яго і багаславілі памяць пра нявінна забітых.

З 1937 па 23 чэрвеня 1941 года энкавэдзісцкія каты – сталінскія камуністы – з дня ў дзень, з ночы ў ноч стралялі тут людзям у патыліцу і ськідвалі ў глыбокія ямы. У гэтых ямах закапаны цьвет беларускай інтэлігенцыі, пісьменьнікі і паэты, артысты, вучоныя і дасьледчыкі, інжэнеры і рабочыя, сяляне і беларускія настаўнікі. Кожную ноч па навакольлі і па ўсёй Беларусі езьдзіў чорны хапун і хапаў людзей. Масква спускала ў Беларусь сваім уладам і катам плян па арыштах і расстрэлах. Вынішчэньне людзей у Беларусі яны рабілі па графіку, штомесячна і штоквартальна. Масква прымала штодзённыя справаздачы аб забітых ахвярах. Толькі ў Курапатах савецкія акупанты забілі каля чвэрці мільёна людзей. Такіх Курапатаў шмат па ўсёй Беларусі.

За часы савецкай акупацыі Беларусі з 1919 па 1953 год (год сьмерці Сталіна) сталіністы-русіфікатары забілі больш 2-х мільёнаў беларусаў ( і гэта ня ўлічваючы вайну). Ворагі чалавецтва зьнішчылі заможнае працавітае сялянства, вынішчылі фізічна амаль дазваньня беларускую шляхту, расстралялі адукаваных людзей.

***Гэта нельга забыць ніколі, пакуль будзе стаяць белы сьвет і будзе жыць Беларусь. Савецкая акупацыя Беларусі пэрыяду Леніна-Сталіна павінна быць прызнаная як рэжым генацыду і пацыфікацыі Беларускага Народу.***

Сёньня Дзяды – сьветлае сьвята памяці і яднаньня з душамі продкаў. Сёньня Дзень усіх хрысьціянскіх Сьвятых, а заўтра Дзень Задушны, які патрабуе малітвы за ўсіх забітых і памерлых, за тыхсьветныя душы.

Запалім жа сьвечкі ў памяць. Паставім іх пад крыжы й на крыжы, на магілы, пакладзем туды белыя кветкі, установім крыжы, што прынесьлі з сабой.

Сёньня нельга сьмяяцца, галёкаць, крычаць. Але ня трэба і жаліцца, плакаць. Сёньня дзень вечнасьці, перад якой мы роўныя ўсе – і тут, і там. Дзяды дапамогуць нам гэта адчуць.

***Шануйма ж нашых дзядоў, нашую слаўную мінуласьць, нашу культуру і веліч і кожнага простага чалавека.***

***Верма ў сьветлыя дні, у нашу прышласьць, у вольную будучыню Беларусі.***

***Зянон Пазьняк***

*1 лістапада 2009 г.*

# МЫ ЗНОЙДЗЕМ НАШ ГРААЛЬ У БЕЛАРУСІ

Важнай падзеяй у беларускім жыцьці ў Нью-Ёрку сталася прэзэнтацыя кнігі „Парсіваль", якую выдаў Зянон Пазьняк. Прыемна, і сымвалічна, што гэтая добрая падзея адбылася напярэдадні вялікага сьвята – Божага нараджэньня (20 сьнежня 2009 г.)

За апошнія гады Зянон Пазьняк выдаў 12 кніжак у сваім выдавецтве „Беларускія Ведамасьці" (у тым ліку „Дарогу", „Вялікае Княства", „Нацыянальныя каштоўнасьці", кнігу С. Навумчыка „Сем гадоў Адраджэньня...", Галіны Пазьняк „Беларусь ў сэрцы", „Гутаркі з Антонам Шукелойцем" і інш.). І кожную кніжку ён робіць сам: прадумвае яе канцэпцыю, стварае макет і мастацкае афармленьне сваіх выданьняў. „Кніга, – заўсёды падкрэсьлівае Зянон Пазьняк, – гэта ёсьць твор мастацтва, гэтаксама, як скульптура, жывапісная карціна і г. д. Той, хто стварае кнігу, – павінен раскрыць сутнасьць літаратурнага твора і ўзмацніць яго ўспрыняцьце. Твор піша аўтар, а кнігу стварае – мастак. Ствараючы кнігу, мастак выяўляе таксама сябе."

Зразумела, што пры такім падыходзе да стварэньня кнігі мы заўсёды бачым і узровень культуры выдаўца, і адлюстраваньне яго творчай асобы, свіго творчага „я".

„Парсіваль" – гэта рыцарская легенда, твор, прасякнуты рэлігійнымі матывамі, і таму за часы бальшавікоў, якія змагаліся з рэлігіяй, ня мог быць перакладзены ў СССР. Між тым гэта вельмі старажытная легенда, якая даўно вядомая ў эўрапейскай і сусьветнай культуры, твор, які быў перакладзены на ўсе эўрапейскія мовы. Гэта легенда пра чалавека, які шукае „сьветлы сэнс жыцьця", шукае Грааль – сьвятую чашу, сьвятое начыньне, зь якога (па легендзе) піў Хрыстос падчас апошняй вячэры перад укрыжаваньнем і якую цудам захавалі апосталы, што сядзелі з Хрыстом за сталом. Чаша валодае магічнымі ўласьцівасьцямі (дапамагае чалавеку ў жыцьці, дапамагае наблізіцца да духоўнага ідэалу – убачыць Бога). Адначасна Грааль зьяўляецца і нечым няўлоўным, духоўным ідэалам, да якога імкнецца чалавецтва.

Па легендзе, Грааль знаходзіцца ў валоданьні рыцараў Грааля, якія яго берагуць. І чалавек, які дасягае Грааля (калі ён можа быць каля яго, быць уключаным у кола гэтых рыцараў), асягае шчасьце, духоўнае і чалавечае. „Сутнасьць Грааля ў тым, каб чалавек у сваім жыцьці імкнуўся ўдасканаліцца, маючы сьветлую мэту – асягнуць жыцьцё вечнае (сутнасьць духоўнага жыцьця), што вымагае пэўнага шляху, – зазначыў Зянон Пазьняк. – Такі шлях пошуку духоўнага ідэалу нарадзіла Хрысьціянства. Па гэтым шляху разьвівалася эўрапейская культура (адпаведна і беларуская)."

Зянон Пазьняк паведаміў слухачам, якія сабраліся ў грамадзкай залі царквы Кірылы Тураўскага, пра тое, што марыў выдаць „Парсіваля" даўно. Ён распавёў гісторыю выданьня знакамітай легенды: „Калі ў 1944 годзе нашая інтэлігенцыя апынулася на Захадзе, уцякаючы ад бальшавікоў, і жыла ў лягерах для ўцекачоў у розных зонах, то жыць было вельмі цяжка. Тым ня менш, у гэтых лягерах бурліла культурнае жыцьцё. Там дзейнічалі скаўцкія арганізацыі, выдаваліся часопісы, была мастацкая самадзейнасьць, ставіліся спэктаклі і г. д. І вось у лягеры Ватэнштэт у Нямеччыне беларускім дзеячом Леанідам Галяком быў зроблены пераклад „Парсіваля" зь нямецкай мовы і выдадзены маленькім тыражом (на ратапрынце) Янкам Сурвілам.

Гэтую кнігу з пажаўцелымі ад часу старонкамі я знайшоў у 1996 годзе у запыленай шафе ў беларускай царкве ў Нью-Ёрку, зрабіў ксэраксы. Беларусы старэйшага пакаленьня наракалі на тое, што пераклад ня быў належна апрацаваны, адчуваўся падрадкоўнік, неахайнасьць у мове. Таму тэкст быў

мною папраўлены адпаведным чынам, але вельмі ашчадна, каб захаваць характэрныя рысы мовы перакладчыка.”

Упершыню З. Пазьняк выдаў пераклад Парсіваля (паўторна) у „Беларускіх Ведамасьцях” у 2001 г. „Але, – як паведаміў выдавец, – мне вельмі хацелася выдаць „Парсіваля” асобным выданьнем, бо гэта гонар любой літаратуры – мець такі твор, які паўплываў на ўсю Эўропу і стаў зьявай эўрапейскай культуры. Інтэлектуальная Эўропа разьвівалася на гэтых ідэях. І сам гэты твор, калі ён быў створаны, таксама паказваў узровень ідэй тагачаснай Эўропы.

На мой погляд, ён павінен быў быць абавязкова перакладзены ў нашай літаратуры і выдадзены кніжачкай. Я вельмі ўсьцешаны, што ўдалося гэтую кніжачку выдаць. Яна зроблена спэцыяльна маленькім фарматам, разьлічана больш на моладзь, каб можна было кніжку пакласьці ў кішэнь і чытаць у любым месцы. Увогуле, я схіляюся да перакананьня, – зазначыў З. Пазьняк, – што ў нашых умовах такі фармат вельмі патрэбны.”

У гэтым творы Зянон Пазьняк выкарыстаў падборку ілюстрацыйнага матэрыяла (гістарычнага і свае ўласныя здымкі). Выданьне зроблена канцэптуальна. На ілюстрацыях-габеленах мы бачым караля Артура (13-14 стагоддзе) і яго войска. Далей (перад 2-м тытулам) фатаграфія – ўваход у браму (раманскі стыль) як бы адпавядае нашаму „уваходу” у гэтую кнігу. З. Пазьняк тлумачыць, як кніга разьвіваецца пазнаваўча і тэматычна. „Уваходзячы” ў кнігу, мы бачым Парсіваля, які наглядае Грааль (тут выкарыстоўваецца рамантычны жывапіс). І далей ідзе разьвіцьцё ідэі праз ілюстрацыі, кожная зь іх – невыпадковая, яе памеры, і нават шрыфты. Усё гэта падбіраецца, каб яно адпавядала твору, каб ўплывала падсьведама на ўспрыняцьце сюжэту.”

На гэтай прэзэнтацыі шмат гаварылася таксама аб творы, аб яго зьмесьце, аб Парсівалі – маладым юнаку, які мае жыцьцёвае пакліканьне. Па легендзе ён вырас у такіх умовах, дзе ня меў ніякага сацыяльнага жыцьця. Яго маці, каралева Герцаляіда, вырашыла выхаваць сына так, каб ён нічога ня ведаў пра рыцарскае існаваньне, каб ён ня стаў рыцарам. Але Парсіваль даведваецца пра рыцараў, пытае ў маці, што такое Бог. Ён хоча служыць Богу і ня ведае, як гэта зрабіць (але юнак ужо разумее, што жыцьцё трэба пасьвяціць гэтаму вышэйшаму ідэалу, які яго кліча).

„Адно з сьведчаньняў гэтага твора, – зазначыў у сваім слове З. Пазьняк, – героі легенды не ілгуць адзін аднаму. І як бы ні хацела схаваць праўду Герцаляіда ад сына, яна ня можа сказаць сыну няпраўду, калі сын наўпрост пытаецца ў яе, ці гэта дрэнна быць рыцарам. Бо сын яе павінен вырасьці чалавекам маральным. І яна адказвае сумленна, нягледзячы на тое, што яе адказ руйнуе ўсю яе „канцэпцыю” выхаваньня сына (прывязаньня яго да сябе). Яна ня можа супроцьстаяць лёсу сына, калі яго кліча Бог (ён павінен адкрыць Грааль, і гэта ёсьць тое пакліканьне, якое наканавана Парсівалю). І Парсіваль едзе ў сьвет шукаць Бога, каб стаць рыцарам.”

У працэсе гаворкі Зянон Пазьняк прыводзіў некаторыя цытаты, у якіх канцэнтравана выяўленыя філясофскія думкі-погляды на асаблівасьць мацярынскай любові, рабіліся праекцыі ў філясофскія канцэпцыі Эрыха Фрома, Фройда, крыніцай высноваў якіх былі старажытныя ідэі (фізіялягічныя асновы мацярынскай любові і сацыяльныя асновы бацькоўскага выхаваньня; які вынік дае аднабокае – мацярынскае ці бацькоўскае – выхаваньне). Цытаваліся філясофскія разважаньні, напісаныя каля 800 гадоў таму, якія пацьвярджаюць думку, што прырода чалавека і чалавечых адносінаў не зьмяніліся. Іх сутнасьць засталася тая ж, што і сотні гадаў таму.

„З аднаго боку „Парсіваль” – гэта легенда, – працягваў гаворку З. Пазьняк, – з другога боку, твор мае рысы сучаснай літаратуры, дзе паказана разьвіцьцё вобраза. Парсіваль пачынаў шлях да Грааля з таго, што ня ведаў акалючага сьвету, не арыентаваўся ў ім і зь яго ўсе сьмяяліся. Ён быў, як блазен, але ў яго была сьветлая чыстая душа, у яго былі закладзены ўяўленьні аб гонары, аб справядлівасьці. І гэта дало яму магчымасьць разьвіцца. Ён стаў справядлівым чалавекам, перамог свой эгаізм, сваю маладую дурноту, здолеў вучыцца на сваіх памылках і на сваім вопыце. Усё гэта паказана ў творы. І мы гэта ўспрымаем прыхільна, бо ў кожным з нас ёсьць частка Парсіваля. Кожны з нас сустракаецца з сытуацыямі, якія мы вырашаем у падсьведамасьці, і толькі потым асэнсоўваем, што мы зрабілі. І ў гэтай легендзе мы бачым ня толькі разьвіцьцё сюжэта, але разьвіцьцё душы чалавека па шляху да ідэала, да Бога.

У творы ёсьць два пачаткі. Адзін – гэта Парсіваль, які жыцьцё прысьвяціў пошуку ідэала, удасканаленьню самога сябе ў дасягненьні Бога. І ў гэтым ёсьць яго сутнасьць. Гэтым ён жыве.

Другі пачатак зьвязаны з іншым тыпам людзей, прыстойных ва ўсіх адносінах, сумленных, працавітых, якія карыстаюцца павагай, але іхны жыцьцёвы ідэал іншы. Яны дасягаюць багацьця, становішча ў грамадзтве, карыстаюцца павагай, бо жывуць і дзейнічаюць па справядлівасьці. І ў гэтым ёсьць сутнасьць іхнага існаваньня. Такі ёсьць рыцар Гаван. Гэта сьмелы рыцар, ён хацеў дапамагчы Парсівалю знайсьці Грааль. Яго не асуджае легенда (як было ў савецкай літаратуры, дзе існавалі фальшывыя ідэалы: маўляў, чалавек, які цікавіцца матэрыяльным, гэта ўжо чалавек абавязкова дробязны і г. д., а ў той жа час уся канцэпцыя камунізму і ягоныя „ідэалы” будаваліся на матэрыялізме). Рыцар Гаван змагаўся за дабро і справядлівасьць, ставіў іншыя мэты і, будучы сьмелым і высакародным, дасягаў іх. Ён змагаўся з духамі, якія былі ў зачараваным замку, і перамог іх, ахвяруючыся дзеля людзей.

І калі Гаван перамог злых духаў, вызваліў жанчын, якія былі там нявольніцамі, ён дасягнуў свайго каханьня і шчасьця як ўзнагароду за подзьвігі. Гаван жыў у гэтым замку, надзвычай прыгожым і багатым. І жонка ў яго прыгожая, і багацьця поўна. Ён прапануе Парсівалю жыць тут разам, у замку (бо ўсё ж ёсьць).

Але Парсіваль шукае іншых рэчаў, ён не знаходзіць у матэрыяльнай велічы і багацьці дастатковага задавальненьня... Яму гэта не прыносіць радасьці. (І такіх людзей мы ведаем усьцяж, якія жывуць дзеля ідэі, дзеля Беларусі, дзеля справы, і якім гэтае багацьце (якому радуецца іншы) – ня ёсьць каштоўнасьць. Тут адлюстраваны падзел ў прыродзе чалавека. Тут вечны канфлікт – якая ідэалёгія, якая сацыяльная група бярэ верх. Яна тады свае ідэі скіроўвае на ўсіх астатніх.

Мы маем цяпер цёмнага ўзурпатара ўлады ў нашай краіне і разумеем, якія антыкаштоўнасьці ідуць адтуль, бачым, што вырастае шмат людзей, галоўная мэта якіх – як уладкавацца ў жыцьці, мець паболей грошай. Яны нават ня чулі пра тое, што ёсьць рэчы, перад якімі ўсе гэтыя каштоўнасьці – проста попел. „Я не знаходжу ў іх дастатковага задавальненьня”, – як кажа Парсіваль.

Гэты твор паказвае, што ідэал вось тут, побач, і да яго трэба імкнуцца. Такія людзі і такія вобразы павінны быць „настаўнікамі жыцьця”, на іх трэба кіравацца. Гэта ёсьць вышэйшае: чалавек, які імкнецца да вечнага, да ідэальнага, да Бога.

Вось такія сэнсавыя дыялогі, карціны, моманты ёсьць па ўсім творы. Цікавыя разважаньні пра сутнасьць каханьня да жанчыны, пра прызначэньне жанчыны, пра адносіны да грамадзкай справы. І гэта ўсё – у кароткіх дыялёгах, якія ўспрымаюцца натуральна, але па сутнасьці яны зьместоўна (па-філясофску) распрацаваныя.

Здавалася б (на першы погляд), такая тыповая сярэднявечная легенда, а чаму яна зрабіла такі ўплыў на эўрапейскую культуру? 800 гадоў таму – а да гэтага вобраза (Парсіваля) пастаянна зьвяртаюцца мастакі, музыканты, іншыя творцы. Бо ў ім закладзена чалавечая мудрасьць, прытым – у простых рэчах, зь якімі пастаянна спатыкаюцца людзі ў сваім жыцьці. І чалавек, нават калі не здае сабе справы, ён гэтыя пытаньні пастаянна вырашае ў сутыкненьні з рэчаіснасьцю. Тут, у гэтым творы, паказана як бы пуцяводная зорка, дадзены крытэрыі дабра, падказаны накірунак – што ёсьць ідэалам.

Парсіваль знайшоў замак Мантсальвач, ён прышоў туды. Вынесьлі Грааль – ён трошачкі сьвяціўся. Парсіваль бачыць дзіўныя рэчы: усе сумныя, маўчаць. І ён не задаў ні аднаго пытаньня, не пацікавіўся, што за бяда ў гэтых людзей, каб дапамагчы. Пераначаваў у тым замку і паехаў. І тады яму сказалі:”Будзь ты пракляты, ты ніколі ня знойдзеш супакою, у цябе ачарсьцьвела сэрца.” Ён павінен быў выратаваць іх, адрадзіць Грааль – а ён не задаў пытаньняў.

Каб вярнуць сілу Грааля, павінен зьявіцца чалавек, які раскрые сваё сэрца, каб дапамагчы, які прыдзе ў гэты замак, знойдзе сам дарогу і які сам

спытае: „Што з вамі здарылася, чаму вы такія сумныя?" Заўважце – які тут маральны аспэкт: павінен прысьці чалавек з балючым сэрцам. Убачыўшы гора, ён павінен спытаць і прапанаваць сваю дапамогу.

Чаму гэтакія творы чытаюцца з такой прыемнасьцю? Бо ўсё, што тут адбываецца, усе дыялёгі, усе дачыненьні – сьветлыя. Гэта сфэра як бы ўсёпаглынаючага дабра. Адначасна вельмі канкрэтнае жыцьцё, сярэднявечнае, вельмі жорсткае, з рыцарскай разьнёй, з страшнымі забойчымі сцэнамі. І тым ня менш – гэта твор сьветлага духа. Вось у чым галоўная прычына ўплыву легендарнага вобразу Парсіваля і ўсяго твора на эўрапейскую культуру.

З пункту гледжаньня літаратуры, з гледзішча ідэй і ўплыву на сьведамасьць людзей, я лічу, што гэты харошы твор актуальны. Ён шмат дае ўважліваму чытачу, ня кажучы пра тое, што мае займальны сюжэт, дзеяньне энэргічна разьвіваецца, добра пабудаваныя дыялёгі. Па ім трэба здымаць фільмы (і фільмы робяцца на Захадзе). Думаю, што з цягам часу і на Беларусі зробіцца фільм пра беларускага Парсіваля", – падсумаваў Зянон Пазьняк.

З вялікім зацікаўленьнем ішло абмеркаваньне новага выданьня. Паважаны ў беларускай дыяспары спадар ***Антон Шукелойць*** падкрэсьліў актуальнасьць гэтага твора для выхаваньня рыцарскага духу ў сучаснай беларускай моладзі. Ён адзначыў: „Выданьне „Парсіваля" зробленае Зянонам Пазьняком своечасова, калі гэтакая кніжка для нас, беларусаў, асабліва патрэбная. Нягледзячы на 800-гадовы „ўзрост", актуальнасьць твора ня страцілася."

У пацьвярджэньня сваёй думкі сп. Шукелойць прывёў прыклад з сучаснага жыцьця:

„Прэзыдэнт Лукашэнка нядаўна езьдзіў на аудыенцыю да Папы Рымскага. Лукашэнка мае жонку, 2-х сыноў, і да Папы ён мусіў бы паехаць са сваёй жонкай, як гэта робяць кіраўнікі ўсіх дзяржаваў Эўропы. Тым часам ён едзе да Папы – з байстручком, якога ён змайстраваў зь ягонай лекаркай. І вязе ў падарунак Папу лемантар расейскай мовы. Гэта абраза для беларусаў, якая пераходзіць усе межы. Ня можна прыдумаць нічога маральна ніжэйшага. Гэта ніжэй травы (!), – усклікнуў спадар Шукелойць. – Гэтакі вось стан цяперашняга дзяржаўнага павадыра, начальніка нашай дзяржавы ў гэтым часе. І таму, на тле такога нізкага падзеньня, гэтая кніга, што мае 800 гадоў, для нас сягоньня (у час духовага ўпадку) асабліва жывая.

Нягледзячы на тое, што гэта ёсьць пераклад другога выдатнага беларуса Л. Галяка (які перакладаў ня проста, што папала пад руку, а думаючы пра духоўны стан нашага народа), доктар Пазьняк падхапіў гэтую думку, гэты падручнік духовай веліčы чалавека, які для нас сягоньня асабліва патрэбны на тое, каб выхаваць духова моцных людзей, якія б маглі процістаўіцца таму ўпадніцкаму стану, які сягоньня існуе ў нас."

У сваім кароткім слове ***Валянціна Якімовіч*** адзначыла, што першы раз прачытала гэты твор у 2002 г. у часопісе „Беларускія Ведамасьці". „Тое, што зьявілася асобная кніжачка – сказала В. Якімовіч, – вельмі станоўчая зьява ў беларускай культуры. І тое, што яна маленькага фармату, вельмі зручна: ёй лёгка карыстацца ў дарозе. Кніга чытаецца на адным дыханьні, гэта крыніца, зь якой можна чэрпаць „веды", як выхоўваць дзяцей і самога сябе як асобу, яна вартая для чытаньня не адзін раз. Гэта вельмі важная праца Зянона Пазьняка для беларускай культуры, і вельмі крыўдна, што (прайшло восем гадоў!) ніхто пра гэта не напісаў, не адзначыў гэтае ўзбагачэньне нашай белаускай культуры." В. Якімовіч падзякавала З. Пазьняку за выданьне кнігі.

***Уладзімер Цяліца*** прызнаўся, што калі чытаў „Парсіваля", знаходзіўся ў прыўзьнятым аптымістычным настроі. „І ў мяне ўзьнікла асацыяцыя-параўнаньне, што ў нас, беларусаў, ёсьць і свой Парсіваль, і свой Грааль. Калі паглядзець на нашую *Пагоню*, мы ўбачым на ёй і рыцара Парсіваля, і наш сьвяты шасьціканцовы Крыж – наш Грааль. І колеры: белы – колер чысьціні, і чырвоны – колер высакародства, велічы, крыві і пакутаў." Гэтыя словы ў аўдыторыі выклікалі радасныя апладысмэнты.

„Так, – пагадзіліся слухачы. – Легенда Крыжа Эўфрасіньні Полацкай гаворыць нам: той, хто яго забярэ ад нас, – шчасьця мець ня будзе. А калі ён вернецца назад у Беларусь – ён прынясе шчасьце нашаму народу. Таму беларусам вельмі патрэбна знайсьці гэты наш Грааль, каб стаць шчасьлівым народам."



*5. Вокладка выданьня „Парсіваль"*

З. Пазьняк пагадзіўся з думкай, што ў нас, беларусаў, сапраўды ёсьць пэўная канкрэтыка адносна духоўнага ідэала – Крыж Эўфрасіньні. Гэта наш Грааль. Трэба шукаць яго – духоўны наш Грааль, духоўны сэнс Крыжа Эўфрасіньні. „Пры гэтым мы павінны захаваць у душы Грааль і як ідэал Хрысьціянства, і як нацыянальны Грааль, – дадаў З. Пазьняк. – Сістэма нашай адукацыі павінна настрайваць на тое, каб моладзь мела гэты ідэал у сваёй сьведамасьці."

***Ларыса Пузач*** выказала вялікую падзяку Зянону Пазьняку, „што сваімі кнігамі падымае нас духоўна. Я лічу, – сказала спадарыня Ларыса, – што гэтая кніга павінна чытацца беларусамі, яна спажытак для розуму і для душы".

Тыя, хто чытаў „Парсіваля" у „Беларускіх Ведамасьцях" без ілюстрацыяў і другі раз у асобным выданьні, казалі пра 2 узроўні ўспрыняцьця гэтага твора. Першае чытаньне выклікала ўяўленьні і цудоўных замкаў, і гушчароў, дзе праязджаў Парсіваль, і лугоў, дзе адбываліся рыцарскія спаборніцтвы. Калі ж чытачу „адкрыліся" гэтыя рыцары, замкі, гушчары на ілюстрацыях, аказалася – тое, што было ва ўяўленьні (у душы) супала з тымі краявідамі, гушчарамі, замкамі, якія зьявіліся ў кніжцы. „Я ўбачыла, – казала адна з беларусак, – што сьветлы замак і возера, у якім кароль Анфортас лавіў рыбу, чакаючы Парсіваля, ці мясьціна, праз якую праязджаў Парсіваль, ці лужок перад замкам – гэта нашыя беларускія мясьціны. А сьветлы замак Мантсальвач, аказваецца, – таксама ў нас, на Беларусі. Дзякуючы ўдалым ілюстрацыям, наша Беларусь апынулася ў кантэксьце гэтай харошай агульнаэўрапейскай легенды, у кантэксьце нашай беларускай Эўропы і нашых эўрапейскіх каштоўнасьцяў. У душы застаецца ўражаньне радасьці. Гэтая кніга дае накірунак, дзеля чаго трэба жыць чалавеку, што трэба шукаць ў жыцьці сьветлае, высокае, духоўнае, тое, што шукаў Парсіваль, бо сёньня мы ўжо не сумняваемся, што ён, наш Грааль, – у нас, на Беларусі, і мы яго знойдзем.

З прыўзьнятым настроем, з добрымі думкамі яшчэ доўга беларусы не разыходзіліся – размаўлялі, усьміхаліся, выказвалі меркаваньні. Добрае

думаньне і размова аб сьветлым адчыняе лепшае ў душы чалавека. Харошая літаратура у беларускай мове і беларускай форме – найлепшае таму спрыяньне.

***Марыля Якушэвіч***

*Сьнежань 2009 г.*

## МІСІЯ ГЕНШЭРА

10 верасьня ў Менск да Лукашэнкі прыяжджаў вэтэран германскай палітыкі Гэншэр. Ён публічна хваліў Лукашэнку і ягоны парадак, разважаў наконт бліскучых пэрспэктываў беларускай дэмакратыі і правоў чалавека. Абяцаў разьвіваць праграму Усходняга партнёрства, шмат абяцаў. Чарговы акт мітусьні германскіх элітаў вакол дыктатара тлумачыцца проста. Берлін сапраўды баіцца, што гнілы рэжым можа ня вытрымаць крызісу і заваліцца. Тады, як думаюць у Берліне, Беларусь перастане быць бясплатным калідорам для расейскіх газа-нафты з Сібіры ў Нямеччыну. Тады трэба будзе мець справу з нацыянальным беларускім урадам, які не дазволіць гвалціць нашу эканоміку. Вось немцы і дэманструюць гатоўнасьць аказаць падтрымку вялікаму „дэмакрату" са Шклова. Мабыць, і грошы ўжо паабяцалі на ўмацаваньне антыбеларускага рэжыму. І можна было б напалохацца гэтай змовы. Але, ведаючы, як актыўна антыбеларуская хунта раскрадае ўсе замежныя капіталаўкладаньні, беларусы разумеюць усю хісткасьць гэтай нямецкай акцыі паратунку. Ня ўдасца ім выратаваць сваіх шчірліцаў.

***Янка Базыль***

## ВІЗІТ ГЕНЭРАЛА

На прыканцы верасьня ў Беларусь прыязджаў начальнік РПЦ патрыярх маскоўскі Кірыл (ён жа генэрал ФСБ, агентурная клічка „Міхайлаў"). БТ арганізавала нізку тэлесюжэтаў пра ягонае падарожжа. Як заўсёды, беларусы праігнаравалі візыт „арцыбацюшкі." Найбольшую колькасьць асобаў уладам удалося сабраць, здаецца, у Полацку – тры тысячы людзей. Вядома, што зганялі па сьпісах настаўнікаў і вучняў сярэдніх класаў на ўсе сустрэчы з маскоўскім госьцем, які штораз нагадваў, што „Белоруссія – часть сьвятой Русі" (?).

Выглядала ўсё вымушана і штучна. Прыкладна так савецкіх людзей зьбіралі сустрэць якога-небудзь малацікавага баўгарскага генсека Жыўкава або мангола Цэдэнбала. Цікава, што ў выпуску навінаў адразу пасьля шматслоўных (і малапрадстаўнічых) сюжэтаў пра патрыярха БТ паказала кароткі сюжэт пра візыт Папы Рымскага Бэнэдыкта XVI у Чэхію. Сярод іншага сказалі, што „на імшу ў горадзе Брно маліцца з Папам прышло сто тысячаў чалавек"...

***Янка Базыль***

## БЕСПАКАРАНА БЛЮЗЬНЕРЫЛІ НАД БЕЛАРУСАМІ

8-га верасьня Дзень Беларускай вайсковай славы. Рэжым арганізаваў афіцыйную гнюснасьць, пра якую мы адразу не пісалі, бо цяжка пісаць пра сістэматычнае пляваньне ў твар. Пляваньне, якое застаецца без адказу. А было так. 7-8 верасьня антыбеларускі рэжым і асабы з псэўдаапазыцыі вельмі ўзгоднена куражыліся над беларускімі сьвятынямі. З раніцы „Дня беларускай пісьменнасьці" (які рэжым нібыта праводзіў у гэты час) БТ круціла паскудныя рэпартажы на тэму дня. Маладзён з непрыемнай тлустай фізіяноміяй падыходзіў на вуліцах і ў парках сталіцы і зьвяртаўся з мікрафонам да нібыта выпадковых мінакоў, у асноўным вельмі маладых людзей. „Якое беларускае слова вы любіце больш за ўсё?" – пытаўся ён. Некаторыя з апытаных называлі словы. А большасьць рагатала па-дурному і гікала: „А мы не знаем і не понімаем..." Падстаўныя разам з БТ дэманстравалі сваю „русскость" (хаця выглядалі на тыповых мясцовых цынікаў). У канцы рэпартажа маладзён з тлустай фізіяноміяй разваліўся, задраўшы ногі, пад фігурай Сымона-Музыкі на помніку Якуба Коласа і скрывіўся ў зьдзеклівым поклічы: „Размаўляйце па-беларуску!"

На наступны дзень (Дзень Беларускай Вайсковай Славы, 495-я ўгодкі Аршанскай перамогі) у цэнтральным парку сталіцы пад даглядам міліцыі зьбірала свае кадры псэўдаапазыцыйная публіка. Кіраваў ужо вядомы ўсім сваімі паводзінамі Кім. Ён быў заяўнікам (невядома ад якой арганізацыі) „боя падушкамі". Міліцыя папярэдзіла, што біцца можна, але не выкарыстоўваць „забароненай сымволікі". Некалькі сотняў маладых узростам асобаў (сярод іх людзі пазналі шмат бэрэсэмаў) весела біліся падушкамі „у гонар Воршы". Яны аднолькавыя – мярзотнікі ад рэжыму і ад гэбоўскай псэўдаапазыцыі. Калі б такое нейкая агентура паспрабавала наладзіць у Францыі, Харватыі або Эстоніі, то мясцовы люд і ўлады зрабілі б так, што ім ужо не хацелася б куражыцца над сьвятынямі. Але нядоўга ўжо будзе працягвацца гэтае блюзьнерства на нашай зямлі.

***Янка Базыль***

## УШАНАВАНЬНЕ ДЗЯДОЎ У МЕНСКУ

1 лістапада на заклік Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ у цэнтры Менску сабралася вялікая грамада беларусаў. Ад Гадзіньнікавага завода па праспэкце Скарыны рушыла мэмарыяльнае шэсьце пад нацыянальнымі Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі. Людзі несьлі крыжы, кветкі і транспаранты „Ушануйма ахвяраў Курапат", „Дзяды". Шматкілёмэтровы шлях праз цэнтар сталіцы завяршыўся ў Курапатах.

Людзі сабраліся вакол Крыжа Пакутаў, засьпявалі гімн „Магутны Божа". Быў заслуханы зварот Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ Зянона Пазьняка – „Верма ў сьветлыя дні" (публікуецца). Потым калёна рушыла ў цэнтр Народнага мэмарыялу, да трох Крыжоў на Кальварыі.

Да людзей зьвярнуліся з прамовамі сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі, і сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў у Беларусі старшыні Фронту і Партыі. Яны казалі пра неўміручую памяць аб продках, якая яднае беларусаў. Мы – эўрапейскі народ. Наша культура і наша цывілізацыя рэзка адрозьніваюцца ад таго, што існуе і заўсёды існавала на усход ад Беларусі. З Усходу, з Расеі да нас прышлі акупацыя, вынішчэньне, генацыд, паняволеньне і дзікасьць. Там у адкрытую ўшаноўваюць Сталіна, НКВД-КГБ-ФСБ і рабаўладальніцкую савеччыну.

Мясцовы рэжым, які трымае ўладу ў Беларусі, па-эпігонску паўтарае крымінальныя замашкі і дэмагогію сваіх маскоўскіх гаспадароў. Дастаткова ўспомніць, што на штучна ўтворанай „лініі Сталіна" рэжым паставіў помнік кату народаў Сталіну. Яны вызначылі свой ідэал, яны маюць узор для насьледваньня ў сваёй антынароднай палітыцы.

Зьнішчэньне ўсяго беларускага на нашай зямлі набывае ўсё больш пачварныя формы. У нашай краіне паўсюль насаджаецца акупанцкая расейшчына. Маскоўскія мафіёзы будуюць у нашых гарадах свае палацы (на выпадак бунту ў Расеі, каб можна было ўцячы і атабарыцца ў нас).

Рэжым праводзіць жудасны экспэрымэнт над народам, распаўсюджваючы па ўсёй краіне атручаныя радыяцыяй прадукты харчаваньня (лепшая, чыстая прадукцыя вывозіцца ў Расею). Усё робіцца для таго, каб аслабіць наш народ, падарваць ягоныя сілы, падавіць волю да супраціву. У той жа час рэжым пры падтрымцы з Масквы адрэзаў Беларусь ад цывілізаваных краінаў сьвету, ад хрысьціянскай цывілізацыі. Мы задумваемся аб гэтым над магіламі нявінных ахвяраў у Курапатах, якіх забілі расейска-савецкія карнікі-акупанты. І што ж, зноў наш народ павінен цярпець над сабой зьдзек ад гэтых жа ворагаў, ненавісьнікаў Беларусі?




*6. Шэсьце на Дзяды ў Курапаты*

Не павінна паўтарыцца трагедыя генацыду часоў расейска-савецкай акупацыі. Наш народ мусіць салідарна супрацiўляцца злу і Імпэрыі Зла, ратаваць будучыню сваіх дзяцей. Праз год рэжым зьбіраецца праводзіць так званыя прэзыдэнцкія выбары. Але беларусы ўжо маюць досьвед фальшывых выбарчых шоў, дзе людзі нічога не вырашаюць, бо ўсё вырашана за іх круцелямі-фальсіфікатарамі. Мы не павінны дазволіць ашукаць сябе чарговым выбарчым фарсам. Людзі павінны адвярнуцца ад рэжыма, не ісьці на выбарчыя ўчасткі. Няхай рэжым гуляецца сам з сабой і выбірае сам сябе. Узурпатар не мае права выбірацца. Ня трэба ўдзельнічаць у злачынстве.

Эканамічны крызіс прышоў да нас з Расеі, ад злачыннай прывязкі нашай эканомікі да крымінальнай эканомікі Расеі. Працэсы гніеньня гэтай ненатуральнай мафійнай сістэмы вельмі прысьпешыліся ў апошні час у сувязі з эканамічным крызісам. Гэтыя зьявы сьведчаць аб блізкім правале маскоўска-імпэрскага спрута. Разам зь ім праваліцца і мясцовы прамаскоўскі рэжым. Нам ужо цяпер трэба задумвацца над будучыняй і рыхтаваць структуры і кадры для працэсаў нармалізацыі нашага нацыянальна-дзяржаўнага жыцьця. Будучыня Беларусі прыўкрасная. З намі нашы дзяды, наша культура, наш дух. Ніхто не пераможа Беларусь.

Грамада засьпявала гімн „Магутны Божа", усклала кветкі на магілы пакутнікаў, запаліла зьнічкі. Былі ўсталяваны крыжы, якія людзі пранесьлі праз горад. Уніяцкі сьвятар адслужыў Імшу перад Крыжамі на пагорку Кальварыі.

У той жа дзень сябры Каліноўскай рады Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ усклалі кветкі і запалілі зьнічкі каля Крыжа на месцы расстрэлаў беларускіх людзей катамі НКВД у менскім лесе Ваньковіча (парку Чалюскінцаў).

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В.Буйвал).***

*1 лістапада 2009 г.*

# РАСЕЙЦАМ ХОЧАЦЦА СТАЛІНА

14 кастрычніка 2009 г. Славацкая газэта „Novy Cas" паведамляла з Масквы. Унук І. Сталіна Евгеній Джугашвілі падаў быў у суд на „Новую газету", на старонках якой Сталіна назвалі „крыважэрным людаедам". Суд вынес вэрдыкт: газэта не дапусьціла абразы годнасьці згаданай асобы. Суддзя сказаў, што паводле гісторыкаў Сталін уласнаручна падпісаў сьмяротны прысуд для 724 тысячаў людзей. У канцы публікацыі славацкая газэта нагадала, што летась расейскае тэлебачаньне правяло агульнарасейскае апытаньне наконт найбольш выдатных дзеячаў расейскай гісторыі. Расейцы назвалі Сталіна трэцяй па значэньню гістарычнай постацьцю.

Наш камэнтар: Добра, што славацкія журналісты нагадалі пра „усерасейскую любоў да крыважэрнага людаеда". Масква вырашыла пазьбегнуць надта шумнага скандалу ў гарадзкім судзе. Але сталіншчына лезе з усіх шчылін лубянскай імпэрыі.

***Алесь Хадасевіч***

# МАХАЛІ АТАМНАЙ БОМБАЙ

14 кастрычніка 2009 г. Аўстрыйская газэта „Die Presse” цытавала выступ гэбэшніка Патрушава, які служыць цяпер сакратаром рады бясьпекі РФ. Ён сказаў наконт новай ваеннай дактрыны РФ: „У выпадку грубага парушэньня нацыянальнай бясьпекі мы не выключаем нанясеньня атамнага ўдару”. Меліся на ўвазе таксама і лакальныя войны. У канцы артыкула аўстрыйская газэта згадала пра заходніх спэцыялістаў-русістаў. Яны сьцьвярджаюць, што нягледзячы на перамогу над маленькай Грузіяй (якой вельмі выхваляецца Масква) цяперашні стан расейскай арміі і эканомікі не дазволіць Расеі перамагчы ў сур’ёзным ваенным канфлікце.

Наш камэнтар: Крамлёўскія гэбэшнікі махаюць атамнай бомбай. Заявілі, што маюць права першымі наносіць атамны удар. З іхнымі мазгамі ўсё зразумела, іх не пераробіш. Цікава, а што думаюць пра гэта расейскія эліты, моладзь, усё насельніцтва – закладнікі шалёнай хунты? Тое што, што мы там бачым і чуем – нічога ня думаюць.

*Алесь Хадасевіч*

# ЦЕНІ РЭЖЫМУ

Палітыка – гэта найвышэйшая сфэра грамадзкай дзейнасьці. Але яна мае тую асаблівасьць, што ў ёй, як у футболе, „разьбіраюцца” ўсе, і кожны на стадыёне радзіць сваё „мыла на суддзю”. Таму палітык таксама мусіць прызвычаіцца да ўсяго. Нічога не павінна яго зьдзіўляць.

Выдумка Сьвятланы Алексіевіч (у інтэрв’ю для „Нямецкай хвалі”) пра „паліцаяў”, дзе яна прыпісала мне ўсхваленьне нямецкіх „паліцаяў” (чаго ў сапраўднасьці не было), (спасылка: http://charter97.org/ru/news/2009/6/29/19587/ ; http://pbpf.org/art.php?art=113&cat=3&lang=be ) і спроба зноў навесіць на маё імя старыя камуністычныя ярлыкі наштурхнула мяне на думку паглядзець бліжэй некаторыя яе інтэрв’ю і выказваньні, якія я раней звычайна прапускаў ці праглядаў па дыяганалі. Словам, прагледжаны матэрыялы з 2004 па 2009 гг. – усё, што датычыць яе вусных выступаў (інтэрв’ю) пра грамадзтва і палітыку за апошная пяць гадоў. (Яе журналісцкая творчасьць у разгляд не ўваходзіць.)

Тое, што Алексіевіч – гэта савецкі тыпаж, беларусафоб і „каша ў галаве”, было зразумела даўно, але ўважлівы прагляд матэрыялаў за апошнія пяць гадоў выявіў вельмі цікавыя акалічнасьці.

Аказваецца, саўковасьць свайго думаньня і натуры ўсьведамляе сама Алексіевіч і неаднаразова падкрэсьлівае гэта: ***„Я абсалютна савецкі чалавек, з савецкімі комплексамі, і я ганаруся гэтымі комплексамі”.*** (Спасылка: http://www.3dway.org/node/9136 ) (Праўда, часам яна прыводзіць неадпаведныя прыклады для доказу сваёй савецкасьці; але гэта дробязі).

Зь яе разважаньняў паўстае натура, гнаная ўнутраным страхам перад пераменамі, якая ні ў што ня верыць, ня мае ніякіх сьветлых ідэалаў, перапоўненая неакрэсьленай трывогай за будучыню і пэсымізмам. У меркаваньнях часта пазыцыянуе сябе як „мы” і блытаецца са сваім нацыянальным паходжаньнем. Гэта відаць, напрыклад, з інтэрв’ю расейскаму штотыднёвіку „Аиф” (№28), 2006 г.: ***„ Сегодня время великих идей кончилось”.*** І далей: ***„Каждый из нас может вспомнить моменты, когда он был счастлив. Но, к сожалению, это только моменты. А нам, русским, даже этот скоротечный мир счастья не знаком. Мы его боимся."*** Потым зноў працяг у такім жа дэпрэсіўным стылі: „***Может, такова человеческая природа вообще – нам всегда мало того, что у нас есть? Или это мы, русские, на нашем участке суши, где бескрайние пространства, бесконечные дороги, – такие люди***?” Усе гэтыя выказваньні нейкія ненатуральныя, нагадваюць нейкую дрэнную літаратуру.



*7. Дзяды. Крыжовы шлях у Курапатах*

І ў завяршэньне гэтага сьпісу цытую яе ўяўленьні, што выходзяць за межы здаровага сэнсу: *„**Почему-то все, с кем бы я ни разговаривала, повторяли одну фразу: „Человек в нечеловеческих условиях превращается в животное за три дня". На войне, мучимый страхом смерти, в лагере с жутким унижением. То, что веками накопила культура, вся эта шелуха мгновенно слетает, и вылезает зверь, который не хочет умирать. Страх смерти, наверное, самый большой страх, который в нас заложен***". Выходзіць за межы сэнсу, – бо тое, што яна кажа і як думае, у сапраўднасьці выглядае ў прынцыпе ня так. Усё наадварот – культура і дух трымаюць чалавека чалавекам у невыносных умовах (і асабліва – вера). Гэта агульнавядома і пацьверджана вопытам чалавечай гісторыі і людзкога мартыралогу. Тут усё, што сказана Алексіевіч, элемэнтарная няпраўда. І „страх сьмерці" ня самы вялікі страх, і культура не зьлятае „за тры дні", і не „шалупіньне" ёсьць культура, а сутнасьць чалавецтва. За такімі дэпрэсіўнымі фразамі ўжо стаіць нехта з рагамі. І гэта дрэнна, бо сьвет і чалавек – іншыя.

З пазыцыі рацыянальнага асэнсаваньня, вышэйпрыведзеныя выказваньні не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Гэта проста глупствы, што часта без засяроджаньня праходзяць міма вушэй слухача, які ня ўслухваецца ў плынь экзальтаванай сьведамасьці.

Усе яе маналогі адзначаны такой „завумнай", містыфікаванай сацыяльна-бытавой банальшчынай, вельмі падобнай на слоўны вадаспад Лукашэнкі (толькі лексіка іншая).

***„На чым трымаецца адчуваньне, што мы беларусы?*** – задае сабе райкінскае пытаньне Алексіевіч. ***– На крыўдзе на ресейцаў, яны багатыя, а мы..."*** (Спасылка: http://www.svaboda.org/content/article/759626.html )

Некалі расейцы называлі такога тыпу разважаньні тэрмінам „боты ўсьмятку". Толькі ўдумайцеся, што яна тут гаворыць! Але нават і гэта даволі адпаведна кладзецца на мэнтальнасьць савецкага чалавека, якую яна ўсьведамляе, разумее і якой ганарыцца.

Беларускі народ у яе – гэта ў асноўным сяляне-калгасьнікі, ***„маленькі любімы мной беларус, катораму сапраўды хапае гэтага гаршчка капусты".*** (Спасылка: http://www.svaboda.org/content/Transcript/1351319.html )

Вось такая любоў і такі ў яе „беларус". (Нешта тут цягне нават не на савецкую, а яшчэ на царскую прапаганду, да Пшчолкі і Саланевіча). Дарэчы, тут выяўлена таксама тыпова савецкае (ненацыянальнае) уяўленьне пра народ. Саветы народам лічылі працоўныя масы, якія займаюцца ручной працай (была „партыя" і быў „народ"; „партия" і „народ" былі „едины").

Практычна, усе яе маналёгі напоўненыя такой саўковай безвыходнасьцю ***(„ня ведаю, што рабіць"; „мы абсалютна без пастыраў"; „доўга гэты прамежкавы стан не пратрымаецца. І ня будзе беларускай дзяржавы;" „нас чакаюць вельмі цяжкія часы;" „скончыўся час вялікай гісторыі;" „людзі расчараваліся ва ўсіх ідэях"; „беларусы – нацыя, якая спазьнілася, сыходзіць зь вялікай гісторыі;" „мы, беларусы, недафармаванае цела...")*** – і гэтак далей, цэлы сеанс суіцыднага мазахізму. (Спасылкі: http://www.svaboda.org/content/article/759626.html; http://gazetaby.com/index.php?sn_nid=7467&sn_cat=35 і інш.)

Тут, аднак, збольшага ўсё псіхалёгія і мэнтальнасьць. Ідэалёгія і сьветапогляд цяперашняга саветызму – гэта ёсьць лукашызм, і выяўляецца ён у адносінах да Лукашэнкі і да беларускага нацыянальнага Адраджэньня ці да нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі.

Ва ўсіх матэрыялах Алексіевіч, прагледжаных мной, нідзе ні разу няма крытыкі з непрыняцьцем Лукашэнкі. Хвала савецкаму дыктатару пабудавана на інверсіі і вымаўляецца цераз агаворкі і ўмоўныя адступленьні лёгка-крытычнага і (у асноўным) пазыцыйнага стану. Вось тыповае (шмат дзе паўторанае) выказваньне: ***„Я не прыхільніца Лукашэнкі, але Беларусь, як тое ня дзіўна, трымаецца на ім."*** (Спасылка: http://gazetaby.com/index.php?sn_nid=7467&sn_cat=35 ).

Зрэшты, працытуем болей: ***„Ня ўсё проста і з Лукашэнкам. У любові да яго мяне аніяк нельга абвінаваціць. Але ён здолеў прадоўжыць сацыялізм – заключыў з насельніцтвам сацыяльны кантракт. І цяпер у параўнаньні з Расеяй у нас сапраўды абаронены студэнт, абаронены бедны чалавек, стары чалавек."*** (Спасылка: http://www.svaboda.org/content/Article/1120432.html ). (Тут адкрыты лукашызм і апалагетыка калгаснага рэжыму, ня кажучы, што гэта грубая нацяжка.)

„Лукашэнка ёсьць і будзе такім, якім хоча ***народ. У яго чуцьцё неверагоднае, і ў гэтым ён нашмат наперадзе нас. Ніхто ня будзе падазраваць мяне ў любові да цяперашняй улады, але я магу сказаць, што менавіта гэтая асоба захавала незалежнасьць Беларусі, дала эканамічную стабільнасьць..."*** (Спасылка: http://www.svaboda.org/PrintView.aspx?Id=789011 )

Які ўзорны панегірык!. Усё, як у савецкай дзіцячай песеньцы: „Я Ленина не видел, но я его люблю".

І далей ужо і пра „славянаў": ***„Магчыма, ён*** (Лукашэнка) ***выправіў памылку, калі ўся постсавецкая прастора кінулася ў гэты амэрыканскі варыянт капіталізму, які не падыходзіць ані славянскай мэнтальнасьці, ані славянскай гісторыі."*** (Тамсама).

***„Лукашэнка здолеў даказаць, што ў сацыялізма застаўся рэсурс, што ён ня быў выпрацаваны, што, дарэчы, гаворыць на карысьць Гарбачова, яго маштабу."*** (Спасылка: http://www.3dway.org/node/9136 )

„Лукашэнка маштабу Гарбачова" – ну чым ні элегантны камплімэнт! Толькі памылка тут ёсьць – псіхалягічная. Лукашэнка мроіць сябе вышэй за Гарбачова. Але затое працяг славаблудзтва вельмі вымоўны: ***„Лукашэнка ўскосна даказаў, што калі б у нас былі больш разумныя кіраўнікі, то разьвіцьцё магло б пайсьці іншым шляхам, шляхам народнай дзяржавы, народнага капіталізму, а не намэнклятурнага і не прыхаванага, як у нас зараз."*** (Тамсама).

Даўно вядома, што „президенту мешают" і што кіраўнікі ў нас неразумныя. Вось тое і яно. Алексіевіч жа тут проста „вумніца" і разумніца. Усё „сячэ"! (Дарэчы, і называе тут яна Лукашэнку ласкава: „наш лідар".) Між іншым камуністы таксама лічаць, што сацыялізм – харошы, толькі ў СССР яго „сказілі". Але калі ганарыцца саўковымі комплексамі, то што тут скажаш.

Як напісала Аляксандра Дрынеўская, ***„Лукашэнка і Алексіевіч – гэта Адам і Ева". „Народны давер да Сьвятланы Алексіевіч набліжаецца да абсалютнага".*** (Спасылка: http://arche.bymedia.net/3-1999/andry399.html ).

І Дрынеўская, відаць, верыць, што так, як яна піша, так яно і ёсьць.

Бадай, найбольш антыпраўнае, антыканстытуцыйнае парушэньне за апошнія дзевяць гадоў новага стагоддзя Лукашэнка зрабіў у 2004 годзе, калі правёў незаконны рэфэрэндум аб бесканцовым тэрміне прэзыдэнцтва і сфальсіфікаваў галасаваньне. І незаконнасьць, і фальсіфікацыя былі відавочныя. Народны Фронт, дэмакраты і міжнародная супольнасьць не прызналі гэты рэфэрэндум з прычыны яго антызаконнасьці, антыдэмакратычнасьці яго арганізацыі і галасаваньня.

Што кажа з гэтай нагоды Алексіевіч? А вось што: ***„Я павінна прызнаць, што гэта – перамога Лукашэнкі, як бы мы сябе ні суцяшалі."*** (Ізноў жа, хто гэта „мы"?)

І далей: ***„Мы ня ведалі ўласны народ... А ён аказаўся вось такі, і ён слухае гэтага чалавека, ён выбірае гэтага чалавека".*** (Спасылка: http://www.svaboda.org/PrintView.aspx?Id=789011 )

Магчыма, ніхто на гэтыя словы не зьвярнуў увагі і не заўважыў. Алексіевіч не палітык, і ці мала там хто тады што гаварыў. Але, тым ня менш, пазыцыя тут выяўленая дакладна, нягледзячы на ўвесь слоўны „дэмакратычны антураж". Пазыцыя (ізноў жа) тыпова саўковая. Больш таго – яна лукашысцкая (народ, маўляў, „слухае" і „выбірае" Лукашэнку). Хаця вядома, што гэта былі за „выбары" і што за „галасаваньне", і як пакарысталіся народам.

Істотна выдзеліць, што тут у паводзінах Алексіевіч ідзе ад натуральнага савецкага чалавека, а што ад „лукавага" (гэта значыць – ад „хітрага"). Ад „лукавага" тое, што, маўляў, „я" як бы і ў апазыцыі да рэжыму і крытычна стаўлюся да Лукашэнкі, але каб ні ён... і г. д. Значыцца, адначасна я ўзурпатара і хвалю, бо трэба, маўляў, аб'ектыўна падыходзіць да справы (некалі так Лукашэнка „аб'ектыўна" пахваліў Гітлера).

Такая нескладаная камбінацыя дазваляе вяшчаць за дэмакратыю і здавацца ўсім (асабліва на Захадзе) „передовой женщиной" і нават

апазыцыянеркай. Адначасна „мудрасьць” „аб’ектыўнай пазыцыі” дазваляе хваліць Лукашэнку, абзываць, бэсьціць нацыянальна-дэмакратычны рух і негалосна зарабляць авансы на цярплівасьць рэжыму.

У народзе такога кшталту паводзіны называюць, праўда, па-свойму, але з-за цэнзурных меркаваньняў я тут гэтае слова напісаць не магу. Аднак справа ня ў гэтым. Пазыцыя пахвалы ўзурпатару, выказаная праз агаворкі, павінна, па законах лукашызму, ўраўнаважвацца пазыцыяй нянавісьці да ворагаў „правіцеля”. Інакш гэта ня тое (не сапраўдная пазыцыя).

Для Алексіевіч тут няма ні праблемаў, ні цяжкасьцяў, антынацыянальная рыторыка льецца вольна і нязмушана, пераходзячы ў беларусафобскія нападкі, у залежнасьці ад настрою. ***„Яны*** (гэта значыць нацыяналісты, апазыцыянеры***) не ўяўляюць рэальны народ, ён рускай сьвядомасьці, – вяшчае аўтарка. – Адзіны рэальны палітык у беларускай прасторы – гэта Лукашэнка.”*** *(Радыё „Свабода”, 24 жніўня 2005 г.)*

Адкідваюцца, перш за ўсё, нацыянальныя каштоўнасьці: ***„Няма розьніцы, якая мова, якая культура, галоўнае – дэмакратыя. Пакуль мы (?) ня пусьцім дэмакратыю наперадзе мовы, мы (?) зноў загінем”.*** *(Тамсама).* (І хто гэта „мы”?) Але гэтага выказваньня яшчэ мала. Лягічна павінны зьявіцца нападкі на антыподаў дыктатара, на палітычных ворагаў антыбеларускага рэжыму. І яны зьявіліся, як па раскладу, і вельмі экстравагантныя. ***„Я помню, как Пазьняк призывал белорусов уходить в леса, партизанить и пускать под откос поезда в знак протеста по поводу объединения с Россией.”*** (Спасылка: http://belgazeta.by/20070910.36/480304471/ ). Прытым, хлусячы і вымаўляючы несусьветную лухту, яна яшчэ яе і „памятае”. А л ь б о апошняя („клясычная”) выдумка для „Нямецкай хвалі” пра нямецкіх „паліцаяў” ***„Я помню свой тогдашний разговор с Зеноном Позняком, –*** ізноў „памятае” Алексіевіч, ***– услышанное повергло меня в ужас. Он говорил о том, что надо создать общество памяти полицаев, кто защищал, якобы, Беларусь.”*** (Спасылка: http://charter97.org/ru/news/2009/6/29/19587/



*8. На вуліцы рэжымнага Менска*

Зьдзіўляе, чаму яна (ня будучы знаёмай са мной) так бессаромна ілжэ пра сваю нібыта „памяць”. Зрэшты, можна не зьдзіўляцца. Такія паводзіны вынікаюць з патрабаваньняў парадыгмы лукашызму. Непрыняцьце апанентаў (ворагаў прэзыдэнта) мусіць быць зафіксавана. Інакш нельга засьведчыць лаяльнасьць узурпатару. І праяўляецца яно (гэтае непрыняцьце) праз такую вось агрэсію. (У „паліцаяў” пастаянна бавілася камуністычная прапаганда. Цяпер такія „гульні” – гэта тэст на маральны ўзровень тых, хто імі займаецца.)

Мушу сказаць, што я ня першы, хто зьвярнуў увагу на прычынную і нацыянальна нігілістычную абумоўленасьць выказваньняў Алексіевіч пра беларускі дэмакратычны рух. У 2005 годзе, пасьля яе палітычна непісьменных і непаважлівых словаў пра беларускую мову і дэмакратыю, выказаных у час грамадзкай дыскусіі аб перадачах „Нямецкай хвалі”, з ацэнкамі такіх яе паводзінаў выступіла Алеся Сёмуха (адвакат, сябра Рады БНР; у 1989-90 гг. Сябра Сойму БНФ). У сваім артыкуле „Проста дэмакратыі – няма”, надрукаваным у верасьнёўскім (512) нумары „Беларуса”, яна дакладна ахарактарызавала гэты прыклад савецкага нігілізму і правяла, мякка кажучы, „лікбез” па нацыянальна-дэмакратычнай палітыцы. Алеся заўважыла, што ***„Алексіевіч, фактычна, прыняла на сябе цяжар аргумэнтаў самога Лукашэнкі... Першы – спачатку пабудуем палітычны лад па маім сцэнары, а тады й астатнім ідэям знойдзецца куток. Другі – у паразах вінаватыя нацыяналісты.”***

***„Было б цікава пабачыць хоць адзін прыклад пасьпяховай пабудовы дэмакратыі без нацыянальнай сьвядомасьці, –*** піша Алеся. ***– Што да аргумэнтаў кшталту „няма розьніцы, якая мова, якая культура, галоўнае – дэмакратыя”, дык гэта і ёсьць Вялікая Утопія. Проста дэмакратыі – няма. Нават у найстарэйшай заходняй дэмакратыі, ЗША, спачатку была Дэклярацыя пра незалежнасьць і змаганьне з Торыс, прыхільнікамі каляніяльнай улады, потым Канстытуцыя, а ўжо пазьней дадаткам да Канстытуцыі – дэмакратычныя правы і свабоды. ...Нацыянальна-дзяржаўная сьвядомасьць усіх дэмакратычных дзяржаў нашмат старэйшая за дэмакратыю і ўжо ніяк ня ёсьць яе складнікам. Так што або працягвайма марыць пра проста дэмакратыю, або будзем запрагацца ў доўгі і нялёгкі працэс нацыятворчасьці, калі сапраўды хочам ад людзей дэмакратычнага выбару. ...Расейска-культурная дзяржаўная беларуская сьвядомасьць – гэта тая хімера, якую будуе Лукашэнка, толькі яго мэты ясныя – далучыцца да Расеі на прывабных для яго пэрсанальна ўмовах, а вось мэты некаторых расейскіх дэмакратаў у Беларусі або цьмяныя, або завуаляваныя. Бо з такой сьвядомасьцю (нават калі ўявіць, што яна магчымая) ў асобнай дзяржаве Беларусь няма патрэбы. І нават калі такая дзяржава нейкі час праіснуе, дамінуючая расейская сьвядомасьць немінуча пачне перасьледаваць нацыянальную беларускую сьвядомасьць, зьнішчаць яе і цягнуцца да культурнай і палітычнай мэтраполіі.***

***„Менавіта за агрэсіўнасьць, –*** адзначае Алеся, ***– я лічу непавагу спн. Алексіевіч да перакананьняў і адчуваньня нацыянальнае тоеснасьці людзей, што складаюць нацыянальную апазыцыю і не абавязкова апазыцыю. Абвінавачваць іх у неразуменьні ейных „вышэйшых” мэтаў ды вымагаць падпарадкаваньня ім і ёсьць агрэсія.”***

Ёсьць яшчэ адзін характэрны момант (і бадай ці ня самы істотны), які закранула Алеся Сёмуха, але не патлумачыла яго эўфемістычную форму – гэта палітычна пераносны тэрмін „рамантызм” у пабытавым разуменьні С. Алексіевіч.

Палітычны „рамантызм” у яе ўяўленьні – гэта эўфемізм Беларускай Нацыянальнай ідэі і дзеяньняў, накіраваных на пашырэньне беларускай

нацыянальнай сьведамасьці. Тут (як і паўсюдна) у яе шмат блытаніны, але сэнс, што пад гэтым разумеецца, добра праглядаецца ў кантэксьце ўсяго таго, што яна ў апошні час нагаварыла. Таму і выскокваюць яе заявы кшталту*"рамантызм сёньня злачынны"* ці *„пара скончаць з нацыянальным рамантызмам"* і г. д.

Моц Беларускага руху ў тым, што ён быў заўсёды рухам ідэёвым. Ідэя – першасная сіла. Яна асьвячае, уздымае, арганізуе і вядзе. Той, хто валодае Нацыянальнай ідэяй, той валодае будучыняй. Гэта аксіёмы.

Непрыяцелі беларушчыны заўсёды стараліся цэліць найперш у ідэю. Пасьля гістарычнай перамогі БНФ у 1991 годзе і здабыцьці незалежнасьці Беларусі прайшло шмат часу, адбылася рэстаўрацыя (дакладней – рэвалярызацыя) савецкай сацыяльнай сістэмы, усталяваўся антыбеларускі аўтарытарны рэжым, змагароў за незалежнасьць трактуюць як ворагаў Беларусі (разумей – рэжымнай улады). І тут, у гэты час, у адпаведных колах, у друку пачалі зьяўляцца выказваньні, што, маўляў, дыктатура сталася таму, што недапрацавалі фронтаўцы, бо былі рамантыкамі, а рамантызм у палітыцы шкодны і г. д.

Вось нескладаная мэтодыка для збэшчаньня ідэйнай зброі змаганьня (зброі, якая забясьпечыла перамогу). Адначасна, увёўшы новы ярлычок („рамантызм") і не называючы сутнасьць, можна фабрыкаваць абвінавачваньні. Гэтым мэтадам карыстаюцца непрыяцелі Беларусі і людзі, якія не разумеюць, што гавораць і ня ведаюць, чаго хочуць. Адгалоскі такога падыходу, зразумела, відаць і ў Алексіевіч, якая нават аб'явіла „рамантызм" „злачынствам" (што, праўда, само па сабе гучыць сьмешна).

Непрыяцелі Беларускага нацыянальнага Адраджэньня, якія разважаюць пра „дэмакратыю", рана ці позна становяцца ў адну запрэжку з антыбеларускім рэжымам. Бо рэжым – іхны натуральны саюзьнік. Мы бачым, як ідэалёгія антыбеларускага рэжыму (а раней савецкага), ігнараваньне беларускіх нацыянальных каштоўнасьцяў і рэжымная рэчаіснасьць выбудавалі думаньне Алексіевіч, калі не ў сістэму, то ў акрэсьленую пазыцыю звыклага лукашызму, да якога яна ставіцца быццам бы ў „апазыцыі", але на справе апраўдывае яго існаваньне.

Яна, і падобныя да яе, стыхійна знаходзяцца ў сфэры думаньня і падыходаў каляніяльнай плятформы „статус-кво" і „непрадрашэнства" (хаця можа і ня ведаюць, што гэта такое). Яны не разумеюць сістэмы палітыкі ўнутранай акупацыі, але тым ня менш ніколі не памыляюцца сабе на шкоду і нічога ня робяць на карысьць нацыянальным змагарам, для разьвіцьця нацыянальнай палітыкі.

Гэта ёсьць сацыяльнае залюстроўе, цені рэжыму, працяг яго люстранога існаваньня, вынік якога – адзін і той жа: пагібель беларушчыны, нішчэньне беларускай культуры.

Адносіны да Беларускага нацыянальнага Адраджэньня, да барацьбы за вольную беларускую Беларусь, за яе мову і будучыню, ёсьць адзіным компасам у цяперашнім становішчы. Гэта „магнітная стрэлка", якая пазначае, фармуе і парадкуе шлях. Альбо-альбо. Альбо з антыбеларускім рэжымам, альбо з Нацыянальнай ідэяй і будучыняй Беларусі.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*4 ліпеня 2009 г., Нью-Ёрк*

# ГАЛАДАМОР І ФІЛІСЬЦЕРСКАЯ ЭЎРОПА

13 лістапада 2009 г. Ангельская газэта „Guardian" пісала пра новыя публікацыі даўніх журналісцкіх матар'ялаў, прысьвечаных Галадамору ва Украіне. Брытанскі журналіст Гэрэт Джонс у 1932-33 гг. быў ва Украіне, бачыў жахі арганізаванага бальшавіцкім рэжымам голаду. Ён дасылаў у нямецкія і брытанскія газэты свае рэпартажы. Немцы іх адмовіліся друкаваць. У Брытаніі яны выйшлі ў скарочаным варыянце, дзе рэдактары „зьмякчылі" жудасны вобраз чалавечай катастрофы. У 1935 г. Джонс паехаў у Кітай, адкуль паведамляў пра грамадзянскую вайну. Яго захапілі кітайскія агенты Масквы і забілі. Брытанскія калегі і сям'я Джонса ўпэўнены, што гэта была помста Масквы за праўду пра ўкраінскую трагедыю. У Эўропе быў яшчэ адзін журналіст, які пісаў праўду пра Галадамор у тыя часы: Малькольм Мачэрыдж, таксама брытанец. Затое было шмат журналістаў, што пісалі непраўдзівыя артыкулы на гэтую тэму. Супраць Мачэрыджа накіроўваў свае артыкулы Волтэр Дзюранці. Ён пісаў, што „ва Украіне голаду няма", што „Мачэрыдж паклёпнічае". Цяперашняя Украіна не забыла пра герачных людзей, якіх не хацелі слухаць сучасьнікі. Сёлета Джонса і Макэрыджа ўзнагародзілі ўкраінскім Ордэнам Свабоды.

Наш камэнтар: Усё – як сёньня. Зноў на юдавы грошы Масквы цэлая хеўра журналістаў і іншых спэцоў падманвае заходняе грамадзтва вобразамі „гуманнай і дэмакратычнай Расеі", „Лукашэнкі, які пайшоў па сьцяжыне дэмакратызацыі", „геаічных апазыцыянэраў" кшталту Лебедько & компані і г.д. Але знаходзяцца мужныя людзі, якія паведамляюць на ўвесь сьвет праўду пра народную драму, сапраўдных змагароў і лютых ворагаў чалавецтва. Як і ў даўнейшыя часы, такіх людзей менш, але яны робяць сваю справу, не баючыся шыпеньня гадзюк. Вызваленая Беларусь не забудзе пра сваіх сапраўдных сяброў.

***Алесь Хадасевіч***

# ШЛЯХАМ СЛУЦКАГА ЗБРОЙНАГА ЧЫНУ

Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ правяла мэмарыяльныя мерапрыемствы ў гонар 89-х угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну. 29 лістапада аўтобус з менскімі сябрамі Партыі ад'ехаў на Случчыну. Патрыёты наведалі мясьціны, дзе адбываліся галоўныя падзеі Слуцкага Збройнага Чыну: вёскі Грозаў і Семежава, а таксама мястэчка Вызну (цяпер Чырвоная Слабада). У групе былі маладыя людзі, якія ўпершыню праехалі шляхам славы змагарных случакоў. У мерапрыемствах удзельнічалі фронтаўцы з Салігорска, Слуцка, Баранавічаў, Клецка. Людзі сьпявалі рэлігійныя і ваярскія гімны, гукалі „Слава героям!" і „Жыве Беларусь!" Мітынгі і шэсьці ў кожнай мясьціне адбываліся пад нацыянальнымі Бел-Чырвона-Белымі Сьцягамі і транспаратамі „Слуцкі Збройны Чын. 1920 год", „Беларуская салідарнасьць – наш адказ на расейскую агрэсію". Да Крыжоў, пастаўленых фронтаўцамі яшчэ ў 1990-я гады, былі ўскладзены кветкі. Людзі маліліся, запальвалі сьвечкі і зьнічкі. На мітынгах у розных мясьцінах быў зачытаны зварот Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронта „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „Слуцкі Збройны Чын – прыклад у барацьбе" (публікуецца).

Выступілі Юры Беленькі, выканаўца на Беларусі абавязкаў старшыні Фронту і Партыі, Алесь Чахольскі, адказны сакратар Управы Фронту і Партыі, Уладзімер Раманцоў, сакратар Управы Фронту і Партыі, і Яўген Даўгіловіч, сябра Сойму Фронту і Партыі. Выступоўцы казалі пра неўміручую памяць аб подзьвігу случакоў-беларусаў, якія ўсталі на абарону Бацькаўшчыны ад лютага ворага. Яны не баяліся колькаснай перавагі маскоўскіх бальшавікоў, не шукалі выгодаў, не імкнуліся прыстасавацца да „новай геапалітычнай сітуацыі". Яны сфармавалі народную армію і пачалі біць ворага, які ўварваўся на родную зямлю. Сілы былі няроўнымі, случакам не ўдалося разграміць акупантаў. Але яны выратавалі гонар нацыі і заклалі аснову для далейшага разьвіцьця беларускай дзяржаўнасьці. Случакі змагаліся пад Бел-Чырвона-Белым Сьцягам за Беларускую Народную Рэспубліку. Акупанты вымушаны былі пайсьці на стварэньне БССР. А ў 1991 годзе новае пакаленьне беларускіх патрыётаў здолела дамагчыся ўтварэньня сувэрэннай Беларускай Дзяржавы. Цяпер мы павінны напоўніць нашу Дзяржаву сапраўдным сэнсам, беларускім духам, зрабіць уладу ў нашай краіне сапраўды беларускай. У цывілізаванай краіне ў такія дні і заўсёды кіраўніцтва краіны ўшаноўвае памяць герояў, якія змагаліся за Дзяржаву і незалежнасьць. Дзе яно, сёньняшняе кіраўніцтва? Яго няма і ня можа быць тут, каля сьвятых Крыжоў Случчыны. Гэта яшчэ раз даказвае нам, што гэта ня ёсьць наша, народная ўлада, гэта ёсьць чужынскі акупа-

цыйны рэжым, якому ненавісна ўсё сьвятое і беларускае. Вечна так ня будзе. Вызваліцца ад хама наша краіна, паўстануць помнікі слуцкім ваярам, іх імёнамі будуць названыя вуліцы і плошчы.

Выступоўцы суадносілі даўнія падзеі з нашай сучаснасьцю. Што прынесьлі нам „цывілізатары" з Усходу, носьбіты „святой Русі"? Жудасную тыранію, разбурэньне нацыянальных каштоўнасьцяў, Курапаты і вайну. ***Цяперашнія спадкаемцы сталіншчыны і брэжняўшчыны інтэнсіфікуюць антыбеларускую дзейнасьць. Зьнішчаецца беларуская мова і культура, нашых дзяцей харчуюць атручанымі чарнобыльскімі прадуктамі, а нашу якасную прадукцыю вывозяць у Маскву. За гады прамаскоўскага лукашэнкаўскага кіраваньня насельніцтва Беларусі зьменшылася на 660 тысячаў чалавек – статыстыка вайны! Алкагалізацыя людзей, шалёная карупцыя і дзікі цынізм, які навязваецца нашай моладзі, – вось прыкметы ўнутранай акупацыі Беларусі.*** Маскоўская хунта актыўна і інтэнсіўна зьнішчае свой уласны народ. У Расеі ўсё гніе, валіцца і ляціць з рэек. Але замест таго, каб спыніць гэтыя дэструкцыйныя працэсы, расейскае начальства кідае велізарныя сродкі на зьнешнюю экспансію і падпарадкаваньне суседніх краінаў. Беларусь напоўніцу адчувае на сябе гэтую драпежную палітыку Імпэрыі Зла.

Супрацьпаставіцца гэтаму Злу можна толькі салідарным змаганьнем усіх беларусаў. Кожны беларус павінен зразумець, што нельга ўдзельнічаць у крымінальных праектах дыктатуры. Чарговыя „выбары", запланаваныя дыктатурай на наступны год, зьяўляюцца менавіта такім чарговым крымінальным праектам. ***Байкот дыктатуры! Ніхто на фальшывыя выбары Лукашэнкі!***

Людзі прайшлі шэсьцем праз цэнтар Слуцка. Перад гістарычным будынкам, дзе ў 1920 годзе адбыўся Зьезд Случчыны, быў праведзены мітынг. Да ўдзельнікаў шэсьця далучылася шмат мясцовых жыхароў. На ўсім шляху Слуцкага Збройнага Чыну гучаў гімн „Магутны Божа".

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В.Буйвал).***

# СЛУЦКІ ЗБРОЙНЫ ЧЫН – ПРЫКЛАД У БАРАЦЬБЕ

Настае памятны Лістапад і гэты час зноў нагадвае нам аб змаганьні, аб нашых змагарных продках. Тады, ужо скора сто гадоў таму, людзі ваявалі за свабоду амаль выключна сілай зброі. Цяпер крыху зьмяніўся сьвет, памяняліся прыярытэты, але адзін прыярытэт застаўся і заўсёды застанецца галоўным – гэта чалавек, які здольны змагацца за свабоду. Я кажу „здольны", бо мала толькі „хацець". Ад колькасьці гэтых здольных людзей і залежыць наша свабода.

Слуцкі збройны чын якраз выявіў той стан ( няхай сабе ў абмежаваным месцы) калі за свабоду Бацькаўшчыны гатовы быў змагацца ўвесь народ. Гэтае народнае рушаньне ў гісторыі Слуцкага змаганьня якраз найбольш уражвае нас цяпер, беларусаў, што апынуліся ў цяжкім часе. Слуцкія змагары паказалі нам прыклад моцы духа і салідарнасьці ў барацьбе. Праўда, тады было проста: былі беларусы і быў вораг, які йшоў з усходу. Ён быў відочны і зразумелы, бо йшоў на нас збройнай вайной. Цяпер жа ва ўмовах унутранай акупацыі і антыбеларускага рэжыму нас нішчаць, а ворага як бы й не відаць, ён мімікрыруе пад улады, пад дзяржаўны закон, пад дзяржаўны разбой. І ні кожны беларус разумее, што ўлада над ім у чужых руках.

***Галоўны палітычны зьмест беларускага змаганьня цяпер у тым, каб вышэйшая ўлада ў краіне сталася беларускай, каб яна была ў тых людзей, якія дбаюць пра Бацькаўшчыну, культуру і пра ўвесь народ.***

Дзеля гэтага нашаму грамадзтву патрэбная беларуская салідарнасьць і вольнасьць духа, здольнасьць да барацьбы. У гэтым якраз нам дапамагаюць прыклады слаўнай гісторыі. Мы павінны заўсёды памятаць і ўшаноўваць памяць пра слуцкіх герояў. Нам ёсьць чаму ў іх павучыцца і ёсьць чым ганарыцца ў нашым мінулым.

Праз год рэжым рыхтуе нашаму грамадзтву новае выпрабаваньне – чарговыя фальшывыя і незаконныя выбары Лукашэнкі і чарговае ашуканства людзей. Як бы павялі сябе ў такой сытуацыі нашыя продкі-случакі, што змагаліся з бальшавікамі? Не сумняваюся, што паказалі б сябе разумна, годна і дружна. Нельга цярпець ашуканства і зьдзек над людзмі, законам і правам. Кожны мусіць ведаць, што па закону Лукашэнка ёсьць узурпатар улады і не мае законнага права балатавацца на выбарах. Гэта галоўнае, а як фальсіфікуюць ягоныя выбары, мы ўжо ведаем. Таму наш слуцкі лістападаўскі лёзунг такі: **Выбары – бяз Лукашэнкі! З Лукашэнкам – байкот!**

Нельга прызнаваць крымінал і гвалт над законам. Нельга баяцца і гнуцца перад нахабствам і ашуканствам. Дык узнімем жа Слуцкі сьцяг змаганьня і пераможам.

Жыве Беларусь!

Слава героям!

***Зянон Пазьняк***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*29 Лістапада 2009 г.*

# „КАНЕЦ ГЭБОЎСКАЙ МАСКОЎСКАЙ ІМПЭРЫІ"

21 жніўня 2009 г. Польская газэта „Gazeta Wyborcza" пісала, што Пуцін загадаў праверыць усе стратэгічныя аб'екты Расеі, асабліва гідраэлектрастанцыі. Загад аддадзены ў сувязі з катастрофай на Саяна-Шушанскай ГЭС. Праверылі і змоўклі.

Наш камэнтар: Не выпадкова з экранаў тэлевізараў міністар па надзвычайных сітуацыях РФ Шайгу крычаў тады на прэс-канфэрэнцыі пра тое, як за некалькі дзён да катастрофы ў Саяна-Шушанскім рэгіёне пачалася паніка. Тысячы людзей забіралі сваіх дзяцей з садкоў і піянэрскіх лягяроў, закуплялі паліва і ўцякалі на аўтамабілях за сотні кілёмэтраў ад ГЭС. Людзі штурмавалі крамы і закуплялі соль і прадукты харчаваньня. У выніку цэны падскочылі ў 2-3 разы.

Усё гэта значыць, што работнікі ГЭС ужо паведамлялі пра пагрозу катастрофы на станцыі, гэта стала набыткам грамадзкай думкі. А потым магутная плынь вады сарвала адну з вялізных турбінаў, якая пачала круціцца і ламаць усё вакол сябе. Мільярды тонаў вады маглі абрынуцца праз руіну і пакаціцца далей – уніз, дзе ў расейцаў з савецкага часу стаяць такія ж аварыйныя ГЭС і вялікія гарады. Дарэчы, гэта можа здарыцца ў любое імгненьне. На такі выпадак каля ГЭС у цывілізаваных краінах будуецца абвадны канал, куды можна было б пусьціць плынь вады. У расейцаў каналу няма. Яшчэ ў канцы 1970-х, калі пад чарговую бальшавіцкую дату была пабудавана Саяна-Шушанская ГЭС, праз неякасны бэтон прасочвалася вада. І вось адбылася катастрофа.

Састарэлая імпэрыя існуе ва ўмовах абсалютнай зношанасьці ўсіх тэхналагічных сістэмаў – пра гэта паведамляе шэраг сумленных расейскіх спэцыялістаў. І гэтая дзяржава зьбіраецца будаваць атамную станцыю ў нас у Беларусі!

Расейцы павінны былі б усрыняць апошнюю катастрофу як знак Божы і пачаць пазбаўляцца ад сатанінскай лубянскай хунты. Але для такога патрэбныя сапраўдная, а не падстаўная Царква, адухоўленыя эліты без імпэрскіх комплексаў, нясьпіты народ. У Расеі разгортваецца катастрофа. Беларусам вельмі важна ня быць уцягнутымі ў яе жудасны вір.

* * *

Настала зіма. З Сібіры даходзяць трывожныя зьвесткі ад інжынэраў і праваабаронцаў. Вядомая нядаўняй катастрофай Саяна-Шушанская ГЭС знаходзіцца ў пастаянным аварыйным стане. У Сібіры моцныя маразы. Вада, якая сабралася перад плацінай, ператварылася ў магутную скалу-




*9. Мястэчка Ліпнішкі за часы нямецкай акупацыі ў Першую Сусьветную вайну*

ледавік і навісла над канструкцыяй плаціны. Ледавік можа абрынуцца на плаціну ў любы момант Але гэта абавязкава павінна адбыцца падчас веснавой паводкі. Калі маса лёду або вады разаб'е плаціну, узьнікне хваля вышынёй у 200 мэтраў, якая пойдзе па цячэньню ракі з хуткасьцю 240 км/гадзіну. Цунамі зьмяце ўсё на сваім шляху, загінуць цэлыя гарады да самага Нарыльска і Ледавітага акіяна. Загінуць да двух мільёнаў людзей.

Ужо цяпер адмыслоўцы заклікаюць крамлёўскае кіраўніцтва не займацца аднаўленьнем машыннай залі ГЭС, а спусьціць ваду цераз гэтую залю і больш не эксплуатаваць плаціну. Крэмль адмаўляецца зрабіць гэта. Многія людзі, што жывуць у небясьпечнай зоне, уцякаюць з сем'ямі падалей ад гэтага кашмара. Актывісты пачалі зьбіраць подпісы пад заклікам да ўладаў ліквідаваць Саяна-Шушанскую ГЭС. Сабралі ажно 2 тысячы подпісаў. Бачна, што сьмяротная небясьпека не абудзіла ў сібіраках салідарнасьці ў супрастаяньні злу і гвалту. Шкада людзей, але падобна, што ім не шкада самых сябе і сваіх дзяцей. Гучаць галасы аб тым, што катастрофа будзе азначаць канец гэбоўскай маскоўскай імпэрыі.

*Юрка Марозаў*

# 91-Я ЎГОДКІ СКАНЧЭНЬНЯ І-Й СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ

13 лістапада 2009 г. Нямецкая газэта „Frankfurter Allgemeine Zeitung" пісала пра сьвяткаваньне ў Парыжы 91-х угодкаў сканчэньня I Сусьветнай вайны. Адбыліся вайсковыя і рэлігійныя цырымоніі, у якіх упершыню ў гісторыі ўзаемных дачыненьняў узяла ўдзел вышэйшая прадстаўніца Нямеччыны канцлер Мэркель. У Францыі Дзень Перамір'я 11 лістапада маштабна адзначаецца з 1922 г. У той год было прынята рашэньне усталяваць па ўсёй краіне і на месцах баёў за мяжой 35 тысячаў помнікаў і памятных знакаў у гонар герояў вайны і палеглых жаўнераў. Традыцыя адзначэньня гэтага дня не замірала ў Францыі. У першы год нямецкай акупацыі 11 лістапада 1940 г. парыжскія школьнікі і студэнты сабраліся каля Трыюмфальнай аркі і Магілы невядомага жаўнера з нацыянальнымі сьцягамі і кветкамі нягледзячы на забарону акупантаў. Іх жорстка зьбілі і разагналі. У першы пасьляваенны год 11 лістапада 1945 г. сотні тысячаў людзей начале з генэралам Дэголем прайшлі ад Трыюмфальнай аркі праз увесь горад да могілак. Людзі несьлі 15 трунаў з целамі французкіх патрыётаў, якіх забілі немцы. Дзень 11 лістапада даўно стаў днём памяці пра народную барацьбу за волю і незалежнасьць, адным з сымваляў змагарнай Францыі.

Наш камэнтар: У Беларусі няма аніводнага помніка нашым дзядам, што ваявалі і загінулі ў Вялікую вайну 1914-18 гадоў (у тым ліку і ў Францыі). Бальшавіцкія акупанты абвясьцілі яе „імпэрыялістычнай" і наплявалі на жаўнерскія магілы. У вольнай Беларусі гістарычная справядлівасьць будзе адноўлена.

У гэтай тэме прасочваецца яшчэ адна аналогія. Толькі акупанцкі рэжым можа забараняць нацыянальныя сьвяты, жорстка перасьледваць іх удзельнікаў. Асабліва тыя сьвяты, дзе дэкляруюцца Воля і Незалежнасьць дзяржавы і народа. Ня трэба зьдзіўляцца, што рэжым РБ ненавідзіць Дзень Волі 25 Сакавіка, што хунту калоціць ад мэмарыяльных мерапрыемстваў на Дзяды, на ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну. Усё лагічна.

*Юрка Марозаў*

# ЛЕКЦЫЯ ГІСТОРЫІ

***(Парадоксы ідэолагаў альбо адкуль узяўся падвойны стандарт)***

### Маркс-Энгельс

На фабрыцы Энгельса ў Манчэстэры працоўныя ў найцяжэйшых умовах працавалі па 13 гадзін у суткі ... Заробленых грошай ім зь цяжкасьцю хапала на ежу. Рабочых у Энгельса штрафавалі пры любой нагодзе і пастаянна зьніжалі і без таго жабрацкія расцэнкі. На атрыманыя за кошт

бязьлітаснай эксплуатацыі рабочых сродкі Энгельс утрымліваў Маркса, які ніколі не працаваў, і заклікаў адабраць у капіталістаў іхнія фабрыкі. Правадыры сусьветнага пралетарыяту ні на якіх заводах не працавалі. Падчас Парыжскай Камуны Маркс не рваўся на барыкады, а пісаў камунарам лісты з сваёй лёнданскай кватэры.

**Ленін**

Адзінае справа, якую Уладзімер Ульянаў правёў у судзе, была справа аб патаптаньні сялянскімі коньмі зямель ягонага хутару. Сяляне заплацілі Ульянаву штраф. Маці Леніна здавала зямлю хутара ў арэнду, а грошы пасылала Леніну за мяжу, дзе ён пісаў, што трэба адабраць зямлю ў памешчыкаў.

**Капіталіст**

Буйны расейскі прамысловец Сава Марозаў утрымліваў на свае сродкі партыю бальшавікоў. Прыйшоўшы да ўлады, яны адабралі ў яго нашчадкаў усю маёмасьць, а саміх нашчадкаў расстралялі.

***-інф-***

## „ЖЫВЫ КУРЫЛКА!”

7 лістапада ў Менску адбылася штогадовая камуністычная камэдыя-буф. Каля помніка Леніну сабралася купка з большага старых людзей пад чырвонымі сьцягамі, з партрэтамі Леніна і Сталіна. Быў заўважаны таксама тав. Калякін. Апошняе крыху зьдзіўляе. Тав. Калякін зусім нядаўна перайменаваў сваю кампартыю ў „Справедлівый мір”. Некаторыя думалі, што камуністаў фармальна ў Беларусі ўжо не засталося. Ажно вось як... Жывы курылка!

***Янка Базыль***

## СОЛА ДЛЯ ТЭЛЕВІЗАРА

12 лістапада 2009 г. Француская газэта „Le Figaro” камэнтавала зварот Медведева да расейскага народу. Ёсьць цытаты: „Трэба мадэрнізаваць Расею. Замест эканомікі, заснаванай на сыравіне, мы павінны стварыць эканоміку, якая будзе выдаваць новыя тэхналогії”. Медведев сказаў таксама, што будаваць Расею яны будуць „на дэмакратычнай аснове, каб усё вырашаў народ, а не вярхі”. Заходнія СМІ ўбачылі ў гэтым прыхаваную крытыку Пуціна. Яшчэ Медведев казаў, што расейскае грамадзтва павінна быць „інтэлігентным і адказным”.

Наш камэнтар: Надта позна, таварішчі, гэты канцэрт. Ніхто ўжо ня выратуе ваш гнілы кашмар...

***Юрка Марозаў***

## „МОГІЛКІ МАФІІ”

14 лістапада 2009 г. Італьянская газэта „La Repubblica” апублікавала рэпартаж з расейскіх могілак у Екацерынбурзе. „Могілкі мафіі” уразілі італьянскіх рэпэарцёраў. У 1990-я гады там хавалі забітых у міжусобных войнах мясцовых паханоў мафіі. Ёсьць надмагільлі, кошт якіх складае 250 тысячаў даляраў. На шэрагу фотаздымкаў – тыповыя надмагільлі з выявамі мафіёзаў. Большасьць зь іх на сваіх партрэтах паляць цыгарэты, адзін нават сядзіць за багатым сталом, застаўленым пляшкамі з гарэлкай і шампанскім. Некаторыя паказаны на фоне будынкаў РПЦ з залатымі купаламі. Выразы твараў неідэалізаваныя, можна сказаць, у рэчышчы „капіталістычнага рэалізму”.

Наш камэнтар: Італьянскія рэпарцёры ўдакладнілі для сваіх чытачоў, што Екацерынбург (былы Свярдлоўск) – сталіца „Уралмаша”. Маўляў, вакол постсавецкіх аўтабагацьцяў і круціўся крывавы вір заўральскай мафіі. Гэта ім так патлумачылі прыстаўленыя да іх перакладчыкі. А вось беларусы, якія пражылі ў саўдэпіі не адно дзесяцігоддзе, ведаюць, што поле для мафійнай гульні ў Расеі значна больш шырокае, можна сказаць – неабдымнае. Менавіта ў сьвярдлоўскім рэгіёне знаходзіліся і знаходзяцца дагэтуль каласальныя прадпрыемствы і склады маскоўскага ваенна-прамысловага комплексу і арміі. У мутныя 90-я гады генэралітэт і постпартыйная мафія актыўна раскрадалі („бралі”) гэтыя матэрыяльныя багацьці і прадавалі іх у розныя краіны і гарачыя кропкі. Зброя гуляла па ўсёй Расеі, будучы даволі банальным таварам. Грамадзяне ўспамінаюць, як па вагонах цягніка „Ленінград-Варкута” хадзілі „купцы”, стукаліся ў дзьверы купэ і ўголас рэклямавалі свой тавар, які даставалі з мяхоў: „Ребята, классный гранатомёт и недорого… А ещё гранаты есть и калашники…” Зразумела, што ў такіх умовах сутыкнуліся інтарэсы розных бандыцкіх груповак (большасьць зь якіх дзейнічалі пад эгідай дзяржулады, міліцыі і гэбэ). Ва ўсіх рэгіёнах Расеі паўсталі надмагільныя помнікі братве рознага ўзроўню. Часам бомбы выбухалі падчас пахаваньня чарговага братка і ўдзельнікаў цырымоніі даводзілася хаваць гуртом. Гісторыя сіцылійскай мафіі побач з расейскім кашмарам выглядае, як лёгкая чытанка для падлеткаў.

***Юрка Марозаў***

## „ЛІБЭР-МАРАЗМ”

12 лістапада 2009 г. Француская газэта „Liberation” пісала пра нядаўні крывавы інцыдэнт на амэрыканскай вайсковай базе ў Тэхасе, дзе маёр псіхіятрычнай службы адкрыў агонь па жаўнерах (13 забітых, дзесяткі параненых). Высьветлілася, што маёр амэрыканскай арміі Нідал Малік Хасан – палестынец першага амэрыканскага пакаленьня. Яго зьбіраліся паслаць ваяваць у Ірак. ЦРУ два гады назірала за ім, чытала э-мэйлы, якімі ён перапісваўся з імамам Анварам Аль-Алакі (якога спэцслужбы і дзяржадміністрацыя ЗША ідэнтыфікуюць як галоўнага агента Аль-Каіды, што дзейнічаў у ЗША). Сачэньне за маёрам Хасанам, аднак, спынілі, „бо ў э-мэйлах не было згадак пра джыхад”. Вайсковаму камандваньню пра вынікі назіраньня не паведамілі, „бо гэта парушыла б правы асобы”.

Наш камэнтар: Чытаеш усё гэта, як жанрава няякасны дэтэктыў. Але маразм! І амэрыканцам таксама бокам выходзіць лібэральнае „шматрасавае грамадзтва”.

***Юрка Марозаў***

## „МОБ-ШМОБ” У ЦЭНТРЫ МАСКВЫ

31 сьнежня маскоўская псэўдаапазыцыя наладзіла пацешны моб-шмоб у цэнтры Масквы. Чалавек дваццаць, апранутыя у строі дзедаў-марозаў, гукалі пра неабходнасьць выкананьня крамлёўскімі ўладамі 31-га артыкула канстытуцыі РФ („свабода сходаў і шэсьцяў”). Напрадзе засьвяцілася ў строі Сьнягуркі 83-гадовая „бабушка русской революції” Л. Аляксеева (цяпер начальніца ў маскоўскім „Мэмарыяле”). На пацешных наляцела міліцыя і адвезла іх у пастарунак. У розных сталіцах зрабіўся шум наконт „жорсткіх рэпрэсіяў крамлёўскага рэжыму”.

У гэтых сталіцах не зразумелі, што пацешнае шоў арганізавала і правяло ФСБ, каб выставіць ідыётамі 20 асобаў з псэўдаапазыцыі, каб паказаць усяму сьвету наколькі іх мала і якія яны несур’ёзныя. Падобна, што не зразумелі гэтага і псэўдаапазыцыйныя марозы-сьнягуркі.

А вось у Беларусі многія людзі заўважылі ідэнтычнасьць лубянскага цыркавога праекціка. У Менску таксама гэтай зімой правялі некалькі моб-шмобаў мясцовыя з псэўдаапазыцыі. Яны ў строях марозаў-сьнягурак „прарываліся” у генпракуратуру, лукашэнкаўскія „палаткі”, раздавалі ў сталіцы мінакам нейкія русскоязычныя адозвы. Іх таксама „жорстка

перасьледвалі”, часам адвозілі ў пастарунак. Для беларусаў гэта была знаёмая (паводле маскоўскага тэлебачаньня) імітацыйная дзейнасьць падстаўных дурачкоў.

*Янка Базыль*

## ГЭБІСТЫ ЎЦЯКЛІ Ў РАСЕЮ

1 сьнежня кіраўнік службы па пытаньнях дзейнасьці праваахоўных ворганаў сакратарыята прэзыдэнта Украіны Алег Літвак заявіў, што у замаху на жыцьцё цяперашняга прэзыдэнта Юшчанкі ў 2004 г. удзельнічаў генэрал ФСБ РФ. Чыноўнік не назваў імя генэрала, пакуль ідзе сьледства. Генпракуратура Украіны ўжо апублікавала раней высновы аб тым, што Юшчанку атруцілі падчас вячэры зь ягоным удзелам на дачы Ул. Стацюка, былога нам. начальніка СБУ (спэцслужбы Украіны). Пазьней гэты Стацюк, а таксама былы нам. міністра МУС Украіны Мікалай Белаконь уцяклі ў Расею. Цікава, што тамака іх прынялі як герояў, адразу ж далі расейскае грамадзянства. Белаконь атрымаў пагоны генэралмаёра ФСБ РФ. Мабыць пра яго й згадаў у сваёй заяве сп. Літвак. Да канца раскрываецца яшчэ адно дзяржаўнае злачынства Імпэрыі Зла.

*Янка Базыль*

## ЗМАГАНЬНЕ УЙГУРАЎ

10 ліпеня 2009 г. Чэшская газэта „Mlada Fronta Dnes” паведамляла з краіны ўйгураў. Днямі там адбыліся выступы ўйгурскіх патрыётаў супраць засяленьня іхнай зямлі кітайцамі. Паўсюль маршыруюць кітайскія патрулі. Закрыты мячэці. Пекінскія ўлады пагражаюць расстрэламі ўдзельнікам выступаў.

Наш камэнтар: Нагадаем пару выразных фактаў. Па-першае, вялікі заваёўнік Чынгіз-хан быў уйгурам. Сваю маладосьць ён правёў у мангольскім рабстве, а потым стаўся заснавальнікам вялікай імпэрыі і ардынскай дынастыі. Па-другое, тэрыторыя краіны ўйгураў (цюркскі мусульманскі народ), акупаваная Кітаем, складае адну шостую тэрыторыі цяперашняй КНР. Калі дадаць яшчэ адну шостую акупаванага Пекінам Тыбэту, то карціна „вялікага і магутнага Кітая” адразу ператвараецца ў рыхлую мазаіку. На працягу дзесяцігоддзяў кітайцы (хань) інтэнсіўна запаўняюць акупаваную зямлю мільёнамі сваіх асаднікаў, зьнішчаюць самабытную культуру і мову ўйгураў, расстрэльваюць нацыянальныя эліты і змагароў за незалежнасьць. Уйгурскі народна-вызвольны рух даўно мае сваю партызанскую армію і структуры нацыянальнай адукацыі на роднай мове, не падпарадкаваныя Пекіну. І вось цяпер уйгурская моладзь зноў выйшла на вуліцы і пачала паказваць кітайцам іхнае месца на сваёй зямлі. Пекін не на жарт усхваляваўся, паслаў войскі і сваё гэбэ, каб здушыць народны супраціў. Але народ верыць у сваю перамогу, не баіцца мільёнаў кітайцаў, не апускае рукі. Уйгурскі народ змагаецца і пераможа.

*Валеры Буйвал*

## РУСКАЯ ПСЭЎДАЦАРКВА НА БЕЛАРУСІ Ў ДЗЕЯНЬНІ

І ўсё ж такі беларусам часам трэба глядзець рэжымнае БТ. Там бавае паказваюць „ціка-а-выя” сюжэты. 21 чэрвеня, напрыклад, БТ паказала нізку рэпартажаў пра РПЦ на нашай тэрыторыі. У Берасьці, як паведамлена, „молодёжь активно обсуждает предстоящчій православный молодёжный лагерь”. Каля маладога бацюшкі з выразным жыватом эпікурэйцажыцьцялюба карцінна стаялі тры маладыя асобы і ўдавалі „обсужденіе”: „всю ночь будем петь под гітару” і г.д.



*10. Горад Глыбокае*

Але ня ўсе сюжэты былі такімі сьмешнымі. Адзін зьвярнуў на сябе ўвагу вельмі трывожнай інфармацыяй. У Віцебску мясцовыя бацюшкі РПЦ шыхтавалі юнакоў у камуфляжнай вопратцы на вайсковым пляцы і раздавалі ім граматы пад музыку. Камэнтатар расказаў, што гэта „военно-патріотіческій клуб „Русічі” прі вітебской епархіі”. Тэлегледачы пасьпелі заўважыць, як называюцца падраздзяленьні гэтага „клуба”: „Скіфы” і падобнае. Зразумела, што ў гэтай ваенізаванай арганізацыі для падлеткаў няма нічога беларускага (ды-й хрысьціянскага), усё падкрэсьлена расейскае-акупанцкае. І зразумела, пра які „патрыятызм” там йдзецца.

РПЦ (нібыта рэлігійная структура, мэта якой фармальна ёсьць „мір і благодать”) актыўна займаецца ваеннай падрыхтоўкай падлеткаў з праблемных сем’яў і вучыць іх ваяваць за Расею. Нічога падобнага ў клерыкальных структурах Эўропы не існуе. Тут жа – тыпова чэкісцкая прыдумка іхняй „православной організаціі.” Маскоўска-гэбоўскае цемрашальства адкрыта пранікае ў нашае нацыянальнае жыцьцё з дапамогай псэўдацаркоўнай структуры РПЦ.

*Алесь Хадасевіч*

**З Ь М Е С Т**


1. Бел-Чырвона-Белы Сьцяг у Віцебску . . . . 2
2. Зварот да беларусаў аб выбарах прэзыдэнта . . . . 2
3. Зянон Пазьняк. Аб палітыцы Эўразьвязу . . . . 2
4. Санкцыі павінны застацца . . . . 3
5. Зянон Пазьняк. Ягонае існаваньне – небясьпека для нацыі . . . . 3
6. Распрадаюць Беларусь, каб пазьбегнуць адказнасьці . . . . 4
7. Пастанова Сойму . . . . 5
8. Зянон Пазьняк: „Я разумеў, што творыцца гісторыя” . . . . 5
9. Сяргей Навумчык. Памяць і забыцьцё Курапатаў . . . . 6
10. Зянон Пазьняк. Верма ў сьветлыя дні . . . . 8
11. Марыля Якушэвіч. Мы знойдзем наш Грааль у Беларусі . . . . 8
12. Янка Базыль. Місія Геншэра . . . . 11
13. Янка Базыль. Візіт генэрала . . . . 11
14. Янка Базыль. Беспакарана блюзьнерылі над беларусамі . . . . 11
15. Ушанаваньне Дзядоў у Менску . . . . 11
16. Алесь Хадасевіч. Расейцам хочацца Сталіна . . . . 12
17. Алесь Хадасевіч. Махалі атамнай бомбай . . . . 13
18. Зянон Пазьняк. Цені рэжыму . . . . 13
19. Алесь Хадасевіч. Галадамор і філісьцерская Эўропа . . . . 16
20. Шляхам Слуцкага збройнага чыну . . . . 16
21. Зянон Пазьняк. Слуцкі збройны чын – прыклад у барацьбе . . . . 17
22. Юрка Марозаў. „Канец гэбоўскай маскоўскай імпэрыі” . . . . 17
23. Юрка Марозаў. 91-я ўгодкі сканчэньня 1-й Сусьветнай вайны . . . . 18
24. Лекцыя гісторыі . . . . 18
25. Янка Базыль. „Жывы Курылка!” . . . . 19
26. Юрка Марозаў. Сола для тэлевізара . . . . 19
27. Юрка Марозаў. „Могілкі мафіі” . . . . 19
28. „Лібэр-маразм” . . . . 19
29. Янка Базыль. „Моб-шмоб” у цэнтры Масквы . . . . 19
30. Янка Базыль. Гэбісты ўцяклі ў Расею . . . . 20
31. Змаганьне уйгураў . . . . 20
32. Руская псэўдацарква на Беларусі ў дзеяньні . . . . 20



*Нумар аддрукаваны пры грашовай падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута і на сродкі рэдакцыі.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02–017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**